Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОУНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

124 (7291) | Пятніца, 24 лістапада 1944 г. | Цана 20 кап.

Совецкія воіны загартаваліся ў сражэннях, навучыліся граміць і перамагаць ворага. Чырвоная Армія вырасла ў грозную сілу і пераўзыходзіць ворага сваім воінскім уменнем і баявой тэхнікай.

(І. СТАЛІН).

БОЛЬШ УВАГІ НАРЫХТОЎЦЫ І ВЫВАЗЦЫ ЛЕСУ!

Па ўсёй Беларусі пягнуцца вялікія лясныя масівы. Выдатны беларускі лес да вайны ішоў на патрэбы сваёй рэспублікі і ва ўсе канцы Совецкага Саюза на пабудову новых фабрык, заводаў, плацін, на шахты Данбаса. Лесараспрацоўкі былі адной з асноўных і важнейшых галін прамысловасці Беларусі. Беларускі народ беражна і клапатліва адносіўся да свайго багацця—лесу. Усе работы тут праводзіліся строга па плану, сістэматычна рабіліся новыя лесанасаджэнні.

Крывавыя нямецка-фашысцкія драпежнікі па-варварску знішчалі нашы лясы, выразалі і вывозілі ўсе лепшыя і каштоўнейшыя яго пароды. На тэрыторыі Беларусі быў створан цэлы рад грабежніцкіх фірм па эксплаатацыі нашых лясоў. Апрача таго шматлікія лясныя ўчасткі знішчаліся ваеннымі нямецкімі ўладамі. Гітлераўцы падпальвалі цэлыя лясныя масівы, выразалі лясы вакол гарадоў і сёл, паабапал чыгунак і шасейных дарог.

Выключна велізарны ўрон нанесен фашысцкімі наглтнікамі лясной гаспадарцы Совецкай Беларусі.

Гераічная Чырвоная Армія пад вадзіцельствам геніяльнага палкаводца таварыша Сталіна назаўсёды выгнала нямецкіх бандытаў з нашай зямлі. Усе багацці нашай краіны, у тым ліку і лес зноў сталі ўласнасцю народа. На лесасекі прышлі былыя выдатныя майстры лесараспрацовак, у родных лясах зазвінелі тапары і пілы.

Праклятыя нямецкія захопнікі спалілі, зруйнавалі нашы гарады і сёлы, разбурылі фабрыкі і заводы. Для аднаўлення ўсяго гэтага патрабуецца велізарная колькасць будаўнічых матэрыялаў.

Вызвалены беларускі народ з вялікай энергіяй узяўся за выкананне важнейшай дзяржаўнай задачы—за паспяховае правядзенне лесанарыхтовак і лесавывазкі. Беларускага лесу чакаюць разбураныя гарады нашай рэспублікі, Украіны, Данбаса, знішчаная фашыстамі прамысловасць.

Выконваючы патрабаванне краіны, па-стаханаўску працуюць у Стаўбцоўскім леспрамгасе знатныя лесарубы Владзімір Міцкевіч і Іван Лосік. Яшчэ да вайны яны праславіліся сваёй выключна высокай прадукцыйнасцю працы. Пасля вызвалення раёна яны зноў вярнуліся сюды і цяпер выконваюць свае дзённыя нормы на 700—800 процантаў.

Нядаўна з палкім заклікам шырока разгарнуць лесанарыхтоўчыя работы звярнуліся лесарубы і возчыкі Быхаўскага раёна да работнікаў лясной прамысловасці. Натхнёныя гістарычным дакладам правадыра народаў таварыша Сталіна і той высокай ацэнкай, якую ён даў гераічнай працы ўсяго совецкага народа ў дні Айчыннай вайны, працоўныя Быхаўшчыны абавязаліся па нарыхтоўцы і вывазцы лесу датэрмінова выканаць план чацвертага квартала 1944 г. і першага квартала 1945 года. Быхаўцы цвёрда рашылі даць за зімовы сезон для чыгуначнага транспарта 60.000 кубаметраў дроў, 5.000 кубаметраў шпальнай сыравіны, 20.000 кубаметраў лесаматэрыялаў для шахт Данбаса.

Прыкладаў арганізаванай, высокапрадукцыйнай працы на лясных участках можна прывесці многа. Заклік працоўных Быхаўскага раёна знайшоў гарачы водгук амаль ва ўсіх раёнах Магілеўскай вобласці. Па-стаханаўску арганізавана гэта праца і ў многіх раёнах другіх абласцей. Там, дзе партыйныя і совецкія арганізацыі ўзначалілі працоўны ўздым мас і накіравалі яго на выкананне важнейшых дзяржаўных задач,—там у наяўнасці добрыя вынікі.

Нажаль, не ўсюды кіраўнікі раённых партыйных і совецкіх арганізацый улічылі вялікую важнасць выканання планаў па лесанарыхтоўках і лесавывазцы. У некаторых месцах наглядаюцца несур'ёзныя адносіны з боку совецкіх і партыйных арганізацый да гэтай агульнанароднай справы, і, як правіла, тут з месяца ў месяц зрываюцца планы лясных работ.

Маладзечанская вобласць у IV квартале павінна нарыхтаваць і вывезці каля 300.000 кубаметраў драўніны. Есць усе магчымасці для выканання гэтага задання—і вялікая колькасць цягавай сілы і рабочых рук. Аднак сёння прыходзіцца гаварыць аб сур'ёзным упушчэнні кіраўнікоў вобласці. Тут квартальны план пад пагрозай зрыву. Дастаткова сказаць, што за паўтара месяца па нарыхтоўцы драўніны план выканан толькі на 15,6 процанта і па вывазцы—на 7,4 процанта. Становішча ў радзе леспрамгасаў выклікае яшчэ большую трывогу. Так, Курапецкі леспрамгас кастрычніцкі план выканаў толькі на 6 процантаў, Юрацішкі — на 15,3 процанта, Пастаўскі—на 19,6 процанта.

Есць раёны і ў іншых абласцях, якія выключна дрэнна арганізавалі справу нарыхтовак і вывазкі лесаматэрыялаў і дроў.

Асноўным недахопам у рабоце партыйных і совецкіх арганізацый гэтых раёнаў з'яўляецца тое, што яны не ўмеюць арганізаваць людзей на лесараспрацоўчыя работы, няправільна і нерацыянальна скарыстоўваюць рабочую і цягавую сілу. Сярод лесарубаў і возчыкаў не арганізавана соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, абсалютна адсутнічае палітычная і культурна-масавая работа.

Кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый адстаючых раёнаў і абласцей павінны помніць, што яны нясуць поўную адказнасць за выкананне важнейшага дзяржаўнага задання. Неабходна мабілізаваць усе сілы і сродкі на тое, каб з чэсцю выканаць заданне нашай партыі і совецкага ўрада па забеспячэнню краіны неабходнай колькасцю будаўнічых лесаматэрыялаў і дроў.

Гутарка І. В. Сталіна з панам І. Шубашычам

22 лістапада Старшыня Совета Народных Камісараў СССР І. В. Сталін прыняў Прэм'ер-Міністра і Міністра Замежных Спраў Югаславіі пана І. Шубашыча.

На прыёме прысутнічалі Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў, Намеснік Старшыні Нацыянальнага Камітэта Вызвалення Югаславіі пан Эд. Кардэль і Пасол Югаславіі ў СССР пан С. Сіміч.

Уручэнне ордэнаў і медаляў СССР

22 лістапада намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Н. Я. Наталевіч уручыў ордэны і медалі групе ўзнагароджаных таварышоў.

За ўзорнае выкананне заданняў урада ордэн Чырвонага Сцяга ўручан тав. Хвясько Ф. Ф., ордэн Айчыннай вайны I ступені — Варадзіну А. В., ордэн Айчыннай вайны II ступені — Марозу В. В., ордэн «Знак почета» атрымалі тры чалавекі.

За ўзорнае выкананне заданняў урада па развіццю партызанскага руху ў Беларусі і дасягнутыя поспехі ў барацьбе з нямецкімі захопнікамі ордэн Леніна ўручан тав. Рыжыкаву І. І.

За доблесць і мужнасць, праяўленыя ў партызанскай барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і асобыя заслугі ў развіцці партызанскага руху, ордэн Леніна ўручан тав. Талчынскаму Г. А., ордэн Чырвонага Сцяга атрымалі Краўчанкаў А. К., Мазураў Г. К., Міхайлаў К. П., Повад А. В. і другія — усяго 9 чалавек. Ордэн Айчыннай вайны I ступені атрымалі тт. Бізяеў Л. І., Белаусаў І. С. і другія — усяго чатыры чалавекі. Ордэн Айчыннай вайны II ступені ўручан тт. Падымкіну Н. А., Дваранкоўскаму І. Н. і другім — усяго 6 чалавекам. Ордэн Чырвонай Звязды ўручан 42 чалавекам. Медаль «За боевые заслуги» атрымаў алзін чалавек.

Пасля ўручэння ўзнагарод тав. Наталевіч сардэчна вітаў узнагароджаных і пажадаў ім поспехаў у далейшай рабоце.

(БЕЛТА).

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 22 ЛІСТАПАДА

На працягу 22 лістапада ў Венгрыі нашы войскі з баямі занялі населеныя пункты ЕГЕРСОЛАТ, ДЗЬЕНДЗЬЕШОРОСІ, ДЗЬЕНДЗЬЕШТАР'ЯН, ПЮШПЕКІ, НАДЗЬ-РЭДЗЕ, ХЕВІЗ-ДЗЬЕРК.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў ішлі баі мясцовага значэння.

За 21 лістапада нашы войскі падбілі і знішчылі 43 нямецкія танкі. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 7 самалётаў праціўніка.

* * *

У Венгрыі часці II-скага злучэння выбілі немцаў з вельмі ўмацаваных пазіцый і авалодалі населеным пунктам Егерсолат, размешчаным у 6 кілометрах на захадзе ад горада Эгер. Знішчана 400 варожых салдат і афіцэраў. Спалена і падбіта 9 нямецкіх танкаў. Палонныя паведамілі, што 9 венгерская пагранічная дывізія ў апошніх баях страціла забітымі і палоннымі звыш 60 процантаў свайго асабовага састава. У раёне горада Дзьендзьеш совецкія войскі занялі некалькі апорных пунктаў абароны праціўніка. Захоплена 13 гармат і мінамётаў, некалькі аўтамашын і абоз з ваеннай маёмасцю. На другім участку нашы гвардзейцы адбілі дванаццаць варожых контратак, авалодалі сялеппем Хевіз Дзьерк і трымаюць пад абстрэлам шасе Хатван-Будапешт. У гэтым баі совецкія часці знішчылі да 600 нямецкіх і венгерскіх салдат, падбілі і спалілі 23 нямецкія танкі, 2 самаходныя гарматы і 7 бронетранспарцёраў.

Нашы войскі на розных участках захапілі ў палон 1.050 нямецкіх і венгерскіх салдат і афіцэраў.

* * *

На поўдні ад горада Пултуск адбываліся разведчыя пошукі з абодвух бакоў. На адным участку нямецкая пяхота атакавала нашу баявую варту, якою камандаваў афіцэр Харчэнкоў. Совецкія байцы агнём аўтаматаў і ручнымі гранатамі адбілі атакі колькасна пераўзыходзячых сіл праціўніка. Адступаючы, немцы пакінулі на подступах да нашых пазіцый 30 трупаў сваіх салдат. На другім участку разведчыкі II-скай часці прабраліся ў размяшчэнне немцаў і ўзарвалі два бліндажы. Захапіўшы палонных, разведчыкі ўдала вярнуліся ў сваю часць.

* * *

Караблі Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота патапілі ў Рыжскім заліве тральшчык праціўніка.

* * *

Палонны лейтэнант 2-й роты 252-га сапёрнага батальёна 252-й нямецкай пяхотнай дывізіі Ганс Рыхлінг заявіў: «Вестка аб уступленні рускіх войск ва Усходнюю Прусію зрабіла патрасаючае ўражанне на салдат і афіцэраў. Адбылося тое, што мы лічылі немагчымым, і тое чаго мы больш за ўсё баяліся. Афіцэры абмяркоўваюць пытанне — колькі часу нямецкая армія яшчэ здольна будзе пратрымацца. Выказваюць розныя меркаванні. Многія згаджаюцца з тым, што катастрофа можа разразіцца ў самы бліжэйшы час».

Перайшоўшы на бок Чырвонай Арміі обер-лейтэнант 21-й нямецкай авіяпяхотнай дывізіі Роберт Вольф паказаў: «У пачатку вайны я цвёрда верыў у перамогу Германіі. Цяжкія паражэнні нямецкай арміі паразілі мяне, але я меркаваў, што гэта толькі часовыя няўдачы. Ваенныя і палітычныя падзеі апошніх месяцаў канчаткова перакапалі мяне ў тым, што крах Германіі непазбежны. Цяпер ужо не асобныя нямецкія дывізіі або арміі, а ўся Германія апынулася ў «катле», з якога няма выхаду».

Палонны камандзір 2-й роты 996-га нямецкага вартавога батальёна обер-лейтэнант Ганс Тамаін расказаў: «Я доўга цешыў сябе надзеяй на тое, што ў лагеры праціўнікаў Германіі адбудзецца раскол. Між іншым, некаторыя колы афіцэраў ўсё яшчэ мараць аб гэтым. Цяпер для мяне відавочна, што і гэта наша апошняя стаўка біта. Усе нашы разлікі на крызіс і разлад паміж Совецкім Саюзам і яго саюзнікамі пацярпелі крушэнне».

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 23 ЛІСТАПАДА

На працягу 23 лістапада на востраве САРЭМА (ЭЗЕЛЬ) нашы войскі вялі баі па знішчэнню групіроўкі праціўніка ў паўднёвай аканечнасці вострава і авалодалі вельмі ўмацаванымі апорнымі пунктамі ТЮР'Е, ІДЭ і МЯЭЎЕ.

Караблі Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота 20 лістапада ў выніку бою патапілі адзін мінаносец праціўніка ў паўднёвай аканечнасці вострава САРЭМА (ЭЗЕЛЬ). Авіяцыя флота патапіла ў Балтыйскім моры транспарт праціўніка водазмяшчэннем ў 4.000 тон.

У ЧЭХАСЛАВАКІІ, на поўначы і паўночным захадзе ад ЧОП, нашы войскі вялі наступальныя баі, у ходзе якіх занялі горад ЧЭПЕЛЬ, а таксама больш 30 другіх населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты СОБРАНЦЭ, БУНКОЎЦЭ, ПАЎЛОЎЦЭ, КАПУШАНЫ, ЧЫЧАРОЎЦЭ, НАРАД, СУРТЫ і чыгуначныя станцыі БАТФА, ЧЫЧАРОЎЦЭ. Горад і чыгуначны вузел ЧОП, які пераходзіў з рук у рукі, зноў заняты нашымі войскамі. У ходзе баёў на поўначы і паўночным захадзе ад ЧОП нашы войскі ўзялі ў палон 3 тысячы нямецкіх і венгерскіх салдат і афіцэраў.

У ВЕНГРЫІ нашы войскі з баямі занялі населеныя пункты і чыгуначныя станцыі ТОКАЙ, ТАРЦАЛ.

У баях за 21 і 22 лістапада на тэрыторыі Венгрыі нашы войскі ўзялі ў палон 2.550 нямецкіх і венгерскіх салдат і афіцэраў. Такім чынам з 8 па 22 лістапада на тэрыторыі Венгрыі нашымі войскамі ўзята ў палон 14.470 нямецкіх і венгерскіх салдат і афіцэраў.

На другіх участках фронта—пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў ішлі баі мясцовага значэння.

За 22 лістапада нашы войскі падбілі і знішчылі 10 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 18 самалётаў праціўніка.

* * *

МАСІРАВАНЫ НАЛЁТ НАШАЙ АВІЯЦЫІ НА ПОРТ ЛЕПАЯ (ЛІБАВА)

У ноч на 23 лістапада наша авіяцыя дальняга дзеяння зрабіла масіраваны налёт на порт Лепая (Лібава). У выніку бамбардыроўкі ў порце ўзнікла многа пажараў, якія суправаджаліся выбухамі. Асабліва буйныя пажары адзначаны ў паўночнай частцы ваеннага порта, у новым порце і ў раёне складаў порта-вага ўпраўлення. Разрывы бомб назіраліся таксама сярод нямецкіх транспартаў, якія стаялі на рэйдзе.

* * *

На востраве Сарэма (Эзель) у выніку імклівай атакі совецкія часці выбілі немцаў з некалькіх апорных пунктаў. На полі бою засталося звыш 200 варожых трупаў. Нашы войскі прадаўжаюць цясніць праціўніка і знішчаць яго жывую сілу і тэхніку. За некалькі дзён баёў нашымі часцямі захоплена ў немцаў 50 гармат, 70 кулямётаў і 55 тысяч спарадаў і мін.

* * *

У Чэхаславакіі, на поўначы і паўночным захадзе ад горада Чоп нашы войскі вялі наступальныя баі. Немцы прабавалі спыніць прасоўванне совецкіх часцей у глыбіні свайго абаронча-га пояса. Яны загадзя стварылі на гэтым участку вельмі ўмацаваныя вузлы супраціўлення. Каменныя будоўлі прыфронтавых сёл гітлераўцы ператварылі ў дзоты. У ніжніх паверхах будынкаў устаноўлены гарматы, а на чардаках — кулямёты. Пасля таго, як у абароне праціўніка была прабіта брэш, нашы рухомыя атрады накіраваліся ўперад, абыйшлі варожыя апорныя пункты і акружылі іх. Совецкія байцы з усіх бакоў атакавалі немцаў і пасля ўпорнага бою прымусілі іх скласці зброю і здацца ў палон. Развіваючы поспех, нашы войскі прасунуліся ўперад на 15 кілометраў, авалодалі горадам Чэпель і занялі больш 30 другіх населеных пунктаў. У ходзе баёў захоплены вялікія трафеі, у ліку якіх 64 гарматы, 240 кулямётаў і 120 чыгуначных вагонаў.

Наша авіяцыя актыўна падтрымлівала дзеянні наземных войск. Совецкія лётчыкі знішчылі рад артылерыйскіх і мінамётных батарэй, да 60 аўтамашын і ўзарвалі буйны склад боепрыпасаў праціўніка.

* * *

У Венгрыі часці II-скага злучэння авалодалі населеным пунктам Такай, які размешчан на заходнім беразе ракі Тісы. Развіваючы поспех, нашы падраздзяленні разграмілі гітлераўцаў на гары Такай і пасля ўпорнага бою авалодалі чыгуначнай станцыяй і населеным пунктам Тарцал. На другім участку два палкі пяхоты праціўніка перайшлі ў контратаку. Совецкія пехацінцы і артылерысты сустрэлі ворага моцным агнём. У радах немцаў адбылося замяшанне. Тады нашы байцы нанеслі гітлераўцам удар ва фланг і прымусілі іх адступіць. У гэтым баі знішчана да батальёна варожай пяхоты.

Нашы бамбардыроўшчыкі і штурмавікі наносілі ўдары па баявых парадках і падыходзячых рэзервах праціўніка. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта 14 нямецкіх самалётаў.

* * *

Перайшоўшы на бок Чырвонай Арміі начальнік штаба 1 венгерскай танкавай дывізіі капітан генеральнага штаба Цалфі паведаміў: «Імклівае наступленне совецкіх войск з паўднёвага ўсхода з'явілася поўнай нечаканасцю як для венграў, так і для немцаў. Ніхто і не думаў, што рускія так хутка перасякуць Румынію і Трансільванскія Альпы. Нямецкія і венгерскія войскі ў гэтых баях пацярпелі цяжкія паражэнні. Камандзір 3-й венгерскай арміі генерал-лейтэнант Гайслер нядаўна сказаў: «Лёс Венгрыі рашыўся ў раёне Дэбрэцэна. Цяпер паражэнне Венгрыі неміну-ча». Гайслер—немец па нацыянальнасці. Ён разумее, што Венгрыя прайграла вайну, але прадаўжае гнаць на ўбой венгерскіх салдат. Такіх, як Гайслер, у Венгрыі многа. Ваеннае міністэрства і генеральны штаб венгерскай арміі ўзначальвае немец Бергер. Камандуючыя першай, другой і трэцяй венгерскімі арміямі — немцы. Камандаванне ўсімі венгерскімі войскамі ажыццяўляе нямецкі генерал - палкоўнік Фрызнер. Уся улада ў краіне сканцэнтравана ў руках гітлераўскага намесніка ў Венгрыі Везенмайера. Венгерскія войскі абяссілены. Настрой салдат і афіцэраў падаўлены. Апошнія падзеі прымусілі мяне перагледзець свае погляды. Я прышоў да высновы, што Венгрыя павінна парваць з немцамі і спыніць бяссэнсоўнае супраціўленне совецкім войскам.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
Аб уцвярджэнні нагруднага знака „ОТЛИЧНЫЙ ПОЖАРНИК“

У мэтах заахвочвання асоб радавога і сержанцкага састава пажарнай аховы НКВД, якія асабліва вызначыліся, Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік **пастанаўляе:**

1. Уцвярдзіць для радавога і сержанцкага састава пажарнай аховы НКВД нагрудны знак **«Отличный пожарник»**.

2. Уцвярдзіць палажэнне аб нагрудным знаку «Отличный пожарник».

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль
22 лістапада 1944 года.

ПАЛАЖЭННЕ
аб нагрудным знаку „ОТЛИЧНЫЙ ПОЖАРНИК“

1. Нагрудны знак **«Отличный пожарник»** з'яўляецца ўзнагародай для асоб з радавога і сержанцкага састава часцей пажарнай аховы НКВД, якія асабліва вызначыліся.

2. Нагрудным знакам **«Отличный пожарник»** узнагароджваюцца асобы радавога і сержанцкага састава пажарнай аховы НКВД, якія сістэматычна паказваюць высокія ўзоры:

Выдатных поспехаў па ўсіх відах баявой падрыхтоўкі;

Выдатнага валодання супроцьпажарнай тэхнікай, умелага прымянення яе пры тушэнні пажару;

Смеласці, адвагі, знаходлівасці і ініцыятывы, праяўленай пры тушэнні пажару, пры выратаванні людзей у часе пажараў і аварый, пры ахове ад агню дзяржаўнай і асабістай маёмасці грамадзян;

Пільнасці, якая выразілася ў папярэджанні пажару, а таксама:

За каштоўныя вынаходніцкія і рацыяналізатарскія прапановы, якія садзейнічаюць умацаванню боездольнасці пажарнай аховы;

За выдатную прафілактычную і масавую работу, якая забяспечвае пажарную бяспеку абслугоўваемых аб'ектаў.

Права ўзнагароджання знакам **«Отличный пожарник»** прадастаўляецца Начальніку Галоўнага Упраўлення пажарнай аховы НКВД СССР, Народным Камісарам Унутраных Спраў рэспублік, начальнікам УНКВД краёў і абласцей, з аб'яўленнем аб гэтым у загадзе.

Ад Саюза Совецкіх пісьменнікаў БССР

Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці таленавітага пісьменніка Кузьмы Чорнага (Раманоўскага Н. К.), якая паследвала ў выніку працяглай хваробы 22 лістапада 1944 года.

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Ад Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Упраўленне па справах мастацтваў пры Соўнаркоме БССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці таленавітага пісьменніка - драматурга Кузьмы Чорнага (Раманоўскага Н. К.), якая наступіла пасля працяглай хваробы 22 лістапада 1944 года.

Упраўленне па справах мастацтваў пры Соўнаркоме БССР.

У Соўнаркоме БССР

Совет Народных Камісараў Беларускай ССР устанавіў пенсію сям'і памёршага пісьменніка Кузьмы Чорнага (Раманоўскага Н. К.): жонцы Сверапоўскай Р. І.—у размеры 400 рублёў у месяц; дачцы Раманоўскай Р. Н.—300 рублёў у месяц да поўнагодзя.

(БЕЛТА).

Глыбока вывучаць даклад і загад таварыша Сталіна— баявую праграму нашых дзеянняў

НА СХОДЗЕ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА

22 лістапада адбыўся сход партыйнага актыва Варашылаўскага раёна горада Мінска, прысвечаны вывучэнню даклада таварыша Сталіна на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных аб 27-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Выступіўшы на сходзе загадчык аддзела агітацыі і прапаганды Варашылаўскага РК КП(б)Б тав. Аўзіна падрабязна расказала аб усіх раздзелах даклада таварыша Сталіна. Сваю прамову яна ілюстравала шматлікімі прыкладамі з жыцця раёна і рэспублікі.

— Працоўныя нашага раёна, — гаворыць тав. Аўзіна, — з вялікім патрыятычным уздымам сустрэлі даклад і загад таварыша Сталіна. На ўсіх прадпрыемствах і ва ўстановах адбыліся масавыя чыткі гэтых гістарычных дакументаў. У друкарні імені Сталіна апрача чытак праведзены ўжо 3 заняткі ў гуртках па вывучэнню даклада таварыша Сталіна. На радыёзаводзе створана 7 гурткоў для рабочых і два гурткі для хатніх гаспадынь. Гурткамі кіруюць найбольш падрыхтаваныя таварышы з ліку партыйна-комсамольскага актыва прадпрыемства.

— Намаганнямі працоўных раёна,— прадаўжае тав. Аўзіна, — за кароткі перыяд адноўлена і пушчана дзевяць фабрык і заводаў, якія выпускаюць прадукцыю для патрэб фронта і насельніцтва. У адказ на даклад і загад правадыра народаў — вялікага Сталіна калектывы прадпрыемстваў уключыліся ў социялістычнае спаборніцтва па датэрміноваму выкананню вытворчага плана і актыўнаму ўдзелу ў работах па адбудове горада Мінска.

Першым пасля дакладчыка слова атрымлівае дырэктар друкарні імені Сталіна тав. Вержбаловіч.

— Даклад таварыша Сталіна, — гаворыць ён, — з'яўляецца для нас баявой праграмай дзеяння. Калектыў нашага прадпрыемства ў адказ на даклад правадыра абавязаўся працаваць так, каб поўнасцю знішчыць вытворчыя недахопы і план выканаць датэрмінова. Калектыў друкарні побач з выкананнем вытворчага задання прымае актыўны ўдзел у адбудове горада. Для набыцця будаўнічых спецыяльнасцей у нас створаны гурткі цесляроў, шкляроў, маляроў, сталяроў і каменшчыкаў.

— Пасля азнаямлення з дакладам і загадам таварыша Сталіна, — гаворыць тав. Міронаў, — на радыёзаводзе з новай сілай разгарнулася социялістычнае спаборніцтва. Паміж цэхамі заключаны соцдагаворы на датэрміновае выкананне вытворчага плана. У выніку гэтага значна ўзрасла прадукцыйнасць працы і вытворчы план з дня ў дзень перавыконваецца. Так, механічны цэх сістэматычна выконвае дзённае заданне на 185—200 процантаў, гальванічны цэх — на 180—190 процантаў, дрэваапрацоўчы на 170 — 180 процантаў. Пасля сканчэння працоўнага дня рабочыя з вялікай цікавасцю вывучаюць у гуртках даклад правадыра. Калектыў нашага завода абавязаўся ў сціслыя тэрміны асвоіць выпуск радыёпрыёмнікаў і перавыканаць заданне па рэпрадуктарах.

Затым выступілі: сакратар пярвічнай партарганізацыі Белгандльгародпстрэста тав. Старобінец, намеснік загадчыка аддзела кадраў Варашылаўскага РК КП(б)Б тав. Ламака, нам. старшыні Варашылаўскага райсовета дэпутатаў працоўных тав. Талочка, заг. райАПА тав. Лібо і другія.

Сакратар Варашылаўскага РК КП(б)Б тав. Сугака ў сваёй прамове расказаў аб практычнай рэалізацыі задач, пастаўленых таварышом Сталіным у дакладзе і загадзе, аб удзеле насельніцтва ў адбудове горада.

На сходзе актыва выступіў сакратар Мінскага ГК КП(б)Б па прапагандзе тав. Малочка.

Сход партыйнага актыва прыняў пастанову, у якой намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па глыбокаму вывучэнню даклада і загада таварыша Сталіна, па далейшаму разгортванню социялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах і ва ўстановах як па датэрміноваму выкананню вытворчых заданняў, так і актыўнаму ўдзелу ў работах па адбудове сталіцы.

Там, дзе добра працуюць агітатары

БРЭСТ. (БЕЛТА). Ва ўсіх сельсоветах Брэсцкага раёна створаны і працуюць агіткалектывы. 210 агітатараў вядуць паўсядзённую работу сярод насельніцтва. Лепшым у раёне лічыцца агіткалектыў Лыжыцкага сельсовета. Яго работай умела кіруе стары комуніст тав. Рай. Сістэматычна склікаюцца семінары, нарады агітатараў. Агітатары — комуністы Тарасюк і Іванчанка карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод насельніцтва. У простых, ясных словах яны растлумачваюць палітычныя і гаспадарчыя задачы сялянства ў дні Айчыннай вайны.

Агітатар Тарасюк, прымацаваны да вёскі Малыя Шчыты, за кароткі перыяд правёў 14 агульных і індывідуальных гутарак. Рэгулярна выпускаемы агітатарам баявы лісток асвятляў ход здачы збожжа дзяржаве. Добра пастаўленая агітацыя дала свае плады. Сяляне вёскі Малыя Шчыты першымі датэрміновa разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах дзяржпаставак. Перавыканаўшы план абавязковых паставак, сяляне вёскі Лыжыц здалі 6 тысяч пудоў збожжа па будаўніцтва танкавай калоны, 68 тон — у фонд Чырвонай Арміі. У дні Кастрычніцкіх свят яны адправілі восем чырвоных абозаў з падарункамі байцам і афіцэрам Чырвонай Арміі.

Зараз агітатары праводзяць масавыя чыткі даклада таварыша Сталіна.

З яшчэ большым энтузіязмам

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). Калектывы прадпрыемстваў і ўстаноў, абмеркаваўшы даклад таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі і зварот совецкіх металургаў, бяруць на сябе новыя вытворчыя абавязацельствы па датэрміноваму выкананню дзяржаўных заданняў.

На швейнай фабрыцы «Іншашыву» выступіўшы начальнік швейнага цэха тав. Сонін заявіў:

— Мой цэх у перадкастрычніцкім социялістычным спаборніцтве заваяваў пяршынства. Мы прыкладзем усе сілы, каб і ў далейшым замацаваць дасягнутыя поспехі. Наша задача — падтрымліваць сваімі вытворчымі подвігамі наступальны парыў нашых воінаў па канчатковаму разгрому нямецкіх акупантаў у іх звярыным логаве.

Калектыў фабрыкі рашыў прадоўжыць социялістычнае спаборніцтва і абавязаўся гадавы вытворчы план выканаць на 15 дзён раней тэрміну. Тут ва ўсіх цэхах разгарнулася барацьба за выкананне ўзятых абавязацельстваў. Асаблівых поспехаў у перавыкананні норм выпрацоўкі дабілася майстар швейнага цэха тав. Лапушчык. Яна сістэматычна выконвае тры з палавінай нормы. Ад яе не адстаюць рабочыя тт. Парбук, Окунь, Мейлах і другія.

У гэтыя дні наглядаецца небывалы вытворчы ўздым на рачной прыстані. Усе суднарамонтныя брыгады заключылі паміж сабой социялістычныя дагаворы па лепшае выкананне рамонтных работ. За кароткі тэрмін тут ужо адрамантавана 30 адзінак несамаходнага і 20 адзінак самаходнага флота. Брыгада кавалёў, якую ўзначальвае Апісім Савенка, нарыхтавала 50 кілограмаў цвікоў, 20 кілограмаў скоб і многа балтоў для рамонту суднаў. Кавалі тт. Ражанскі, Позняк і Савенка дзённую норму выпрацоўкі выконваюць на 150 процантаў.

Алесь ЛЯСНЫ.

Друкарня імені Сталіна друкуе па заказу Беларускага дзяржаўнага выдавецтва асобнай брашурай на беларускай мове даклад Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварыша І. В. Сталіна на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Совета і загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна ад 7 лістапада 1944 года.

НА ЗДЫМКУ: стаханаўкі-пераплётчыцы Е. В. Находзька і С. К. Янкоўская сартыруюць гатовыя экземпляры. Фото Л. Мазелева і А. Карніцкага.

Вывучаюць даклад правадыра

ВЕТКА, 22 лістапада. (БЕЛТА). Працоўныя раёна глыбока вывучаюць даклад таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі. Райком партыі выдзеліў у дапамогу вывучаючым 215 агітатараў і 45 дакладчыкаў.

Шырока разгорнута прапагандысцкая работа ў калгасах Радужскага і Сівенскага сельсоветаў. Тут працуе 18 гурткоў па вывучэнню даклада правадыра.

* * *

ХОЙНІКІ, 23 лістапада. (БЕЛТА). З вялікім уздымам у калгасах раёна праходзіць вывучэнне даклада таварыша Сталіна. Ва ўсіх калгасах, соўгасах, МТС, установах прайшлі сходы, прысвечаныя гэтаму дакладу.

У адказ на даклад правадыра калгаснікі сельгасарцелі «КІМ» здалі ў фонд Чырвонай Арміі 4.148 пудоў збожжа. Работнікі Хойніцкай МТС абавязаліся закончыць рамонт трактараў да 1-га студзеня 1945 г. і здаць у фонд Чырвонай Арміі 350 пудоў збожжа і 200 пудоў бульбы.

Дастойны адказ

ГРЭСК, 22 лістапада. (БЕЛТА). Натхнёныя дакладам таварыша Сталіна, калгаснікі раёна, датэрмінова закончыўшыя дзяржпастаўкі, здаюць збожжа звыш плана ў фонд Чырвонай Арміі.

Выступаючы на агульным сходзе сельгасарцелі «Чырвоны партызан», калгаснік Адам Дубавік заявіў:

— Мы татовы зрабіць усё для нашай арміі, для перамогі над ворагам. Кожны пуд нашага хлеба—новы ўдар па ворагу.

Калгаснікі гэтай сельгасарцелі здалі ў фонд Чырвонай Арміі 170 пудоў збожжа.

З велізарнай актыўнасцю праходзіць здача збожжа ў фонд Чырвонай Арміі ва ўсіх калгасах раёна. Ужо здана звыш 200 тон.

ДАВЕСЦІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ ДА ДАВАЕННАГА УЗРОЎНЮ

У даваенныя годы разам з усімі галінамі сельскай гаспадаркі бурна развівалася грамадская жывёлагадоўля.

Амаль ва ўсіх калгасах Магілеўскай абласці было па 3—4 фермы, а іменна—па 1 студзеня 1941 года ў 2.150 калгасах было 2.150 МТФ, на якіх налічвалася 122.488 галоў буйнай рагатай жывёлы, 2.150 аўцаводчых ферм, на якіх налічвалася 108.628 авечак, 2.049 свінаферм з пагалоўем у 56.027 штук і 1.924 птушкафермы з пагалоўем птушкі ў 112.000 штук. Ва ўсіх калгасах абласці былі пабудаваны добрыя жывёлагадоўчыя памяшканні. Дзякуючы ўважліваму догляду расла прадуктыўнасць жывёлы.

Нямецкія акупанты за тры годы свайго гаспадарання знішчылі калгасную жывёлагадоўлю, амаль зусім спалілі жывёлагадоўчыя памяшканні. У Чаускім, Быхаўскім і іншых раёнах абласці не засталося дзесятай долі тых выдатных памяшканняў, дзе калгаснікі атрымлівалі і вырашчвалі цялят, ягнят і парасят. Коней у абласці захавалася ў параўнанні з даваеннай колькасцю толькі 36 процантаў, а ў такіх раёнах, як Быхаўскі, толькі 13 процантаў. Чаускі — 15 процантаў і Горацкі — 20 процантаў.

З першага дня вызвалення калгаснікі абласці з вялікім энтузіязмам узяліся за аднаўленне грамадскай жывёлагадоўлі. Цяпер у калгасах адноўлены 723 фермы буйнай рагатай жывёлы, што складае 80 процантаў да даваеннай колькасці. На гэтых фермах налічваецца ўжо 28.802 галавы жывёлы. Таксама адноўлена 1.263 аўцаводчыя фермы, на якіх ёсць 22.651 авечка, аднаўляюцца свінафермы і птушкафермы. Толькі за лік кантрактацыі на калгасныя фермы пастаўлена 12.532 цяляці. А ў такіх раёнах, як Хоцімскі, Мсціслаўскі і Крычаўскі, па кантрактацыі атрымана цялят значна больш, чым прадугледжвалася планам.

Калгаснікі і калгасніцы нядрэнна папрацавалі ў справе адбудовы жывёлагадоўчых памяшканняў і падрыхтоўкі старых памяшканняў да зімы, а таксама па нарыхтоўцы кармоў. Як напрыклад, у Прапойскім раёне канюшні падрыхтаваны амаль ва ўсіх калгасах. Добра абстаіць справа з падрыхтоўкай канюшань і кароўнікаў у Крычаўскім, Шклоўскім, Бялыніцкім і іншых раёнах. У Прапойскім, Шклоўскім і Бялыніцкім раёнах усе жывёлагадоўчыя памяшканні добра падрыхтаваны да зімы.

У Прапойскім раёне пабудавана 8 новых канюшань, 7 кароўнікаў, 12 цялятнікаў і іншыя жывёлагадоўчыя памяшканні. У Горацкім раёне пабудавана 27 новых канюшань, 8 кароўнікаў і 12 аўчарнікаў. Асабліва добра працавалі калгаснікі па накапленню кармоў для грамадскай жывёлы ў Хоцімскім раёне. Тут, напрыклад, сена нарыхтавана 108 проц. супраць патрэбнай колькасці. Дастаткова нарыхтавалі сена і іншых кармоў для грамадскай жывёлы калгаснікі Чырвонапольскага і Быхаўскага раёнаў.

Змагаючыся за хутчэйшае аднаўленне грамадскай жывёлагадоўлі, у абласці асабліва вылучаюцца такія калгасы, як сельгасарцель «Праўда», Мсціслаўскага раёна. Тут адноўлены чатыры фермы і пасека. Для ўсёй жывёлы да зімы добра падрыхтаваны памяшканні, дастаткова нарыхтавана кармоў.

Калгас «Крэмль», Чырвонапольскага раёна (старшыня калгаса тав. Церашонак) аднавіў тры жывёлагадоўчыя фермы. На МТФ налічваецца 46 галоў жывёлы. Арганізавана тут птушкаферма, на якую калгаснікі па рашэнню агульнага схода здалі па адной птушцы з кожнага двара.

Значная работа па аднаўленню грамадскай жывёлагадоўлі зроблена ў сельгасарцелі «Кастрычнік», Прапойскага раёна, дзе старшынёй працуе дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Нікіта Ермалаевіч Батоўкін. У калгасе адноўлены чатыры фермы. На племянной конеферме ёсць ужо 22 конематкі, у тым ліку 6 племянных. Дзяржава на гэту ферму дадаткова дае яшчэ 12 племянных конематак. У калгасе таксама адноўлены МТФ, свінагадоўчыя і птушкагадоўчыя фермы. Памяшканні ферм добра падрыхтаваны да зімы, для жывёлы нарыхтаваны кармы.

У калгасе імені Сталіна, Горацкага раёна (старшыня калгаса тав. Бялясін), адноўлены МТФ, аўцаводчая і птушкаводчая фермы. За два месяцы калгас пабудаваў тры новыя жывёлагадоўчыя памяшканні: канюшню, кароўнік і аўчарнік.

Такіх поспехаў у развіцці грамадскай жывёлагадоўлі дабіліся многія калгасы абласці. Але ёсць яшчэ калгасы, дзе да зімы не падрыхтаваны для жывёлы памяшканні, недастаткова нарыхтавана кармоў. Напрыклад, у Клімавіцкім раёне больш чым за год пабудавана толькі 6 канюшань і адзін кароўнік. Жывёлагадоўчыя памяшканні да зімы падрыхтаваны толькі на 50—60 процантаў. Не ўсё добра з падрыхтоўкай памяшканняў у калгасах Чаускага і Дрыбінскага раёнаў. Да гэтых пор у калгасах Клімавіцкага і Касцюковіцкага раёнаў не ўсе закантрактаваныя цяляты зняты з кантрактацыі.

Перад партыйнымі, совецкімі і земельнымі органамі нашай абласці, перад спецыялістамі, калгаснікамі і калгаснікамі стаяць неадкладныя задачы—хутчэй аднавіць усе жывёлагадоўчыя фермы, якія былі да вайны, і няспынна ўзбуйняць адноўленыя фермы. Рост пагалоўя жывёлы на фермах галоўным чынам павінен ісці за лік унутраных рэсурсаў.

Трэба за самы кароткі час ва ўсіх калгасах стварыць жывёле нармальныя ўмовы зімоўкі. Для гэтага трэба падрыхтаваць, уцяпліць, адрамантаваць і абсталяваць памяшканні. Асаблівая ўвага павінна быць звернута на ўнутранае абсталяванне памяшканняў і будаўніцтва кормакухань. Зіма не павінна спыніць будаўнічых работ па аднаўленню жывёлагадоўчых памяшканняў. Наадварот, гэты час трэба ўсямерна скарыстаць для хутчэйшага аднаўлення канюшань, кароўнікаў, аўчарань і птушнікаў.

З пачаткам стойлавага перыяда трэба ўстанавіць у кожным калгасе строгі кантроль за выдаткаваннем кармоў. На жывёлагадоўчыя фермы трэба падабраць лепшых калгаснікаў, асабліва тых, якія і да вайны працавалі на фермах. Асаблівая ўвага павінна быць звернута на захаванне коней і на навядзенне парадку ў канюшнях.

Паспяхова вырашаючы ўсе гэтыя пытанні, калгаснікі абласці здолеюць за самы кароткі час давесці грамадскую жывёлагадоўлю да даваеннага ўзроўню.

І. МАНГАЛЕЎ,
намеснік начальніка Магілеўскага аблза.

100-годдзе з дня смерці І. А. КРЫЛОВА

Урачыстае паседжанне ў Вялікім тэатры Саюза ССР

21 лістапада ў Вялікім тэатры Саюза ССР адбылося ўрачыстае паседжанне Усесаюзнага Камітэта па правядзенню 100-годдзя з дня смерці І. А. Крылова.

Ушанаваць памяць вялікага рускага байкапісца сабраліся шматлікія прадстаўнікі грамадскасці сталіцы — стаханаўцы маскоўскіх прадпрыемстваў, пісьменнікі, вучоныя, артысты, генералы і афіцэры Чырвонай Арміі. У зале прысутнічалі прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса.

Урачыстае паседжанне адкрыў Дзем'ян Бедны.

Слова для даклада аб вялікім народным байкапісцы прадастаўляецца Н. С. Тіханаву.

— Крылоў, — гаворыць тав. Тіханаў, — больш, чым паэт. Ён асветнік і філосаф, які жыве мудрасцю народа, ён і драматург. Нездарма яшчэ Белінскі ўказваў на драматычныя ўласцівасці яго баек. Нездарма Гогаль гаварыў аб ім: яго прытчы — здабытак народны і складаюць кнігу мудрасці самога народа. Нездарма Пушкін знаходзіў у байках Крылова адметную ўласцівасць нашага народа: «Веселое лукавство ума, насмешливость и живописный способ выражаться».

Дакладчык падкрэслівае, што крылоўскія словы жывуць у нашым паўсядзённым жыцці, у друку, у жывой мове. Владзімір Ільіч Ленін карыстаўся ў сваіх выступленнях яго яркімі афарыстычнымі строфамі. Вялікі Сталін звяртаецца да крылоўскай вобразнасці.

Далей Н. Тіханаў характарызуе жыццё і творчасць вялікага рускага байкапісца, яго творчы шлях.

Новы змест атрымала крылоўская сатыра ў эпоху Вялікай Айчыннай вайны.

Хіба жаба, якая збіралася параўнацца з валом, раздулася і лопнула, не падобна на фашызм, фанабэрысты, саманадзейны, з форсам раздуты ад лёгкіх перамог. Хіба не падобна сёння дэфэктыўная гітлераўская стратэгія на Трышкін кафтан — уся ў латах, якая раз за разам рвецца, то на ўсходзе, то на захадзе, то на поўдні, пад пабеданосным націскам Чырвонай Арміі і армій нашых саюзнікаў?

Гітлераўцы, — гаворыць Н. Тіханаў, — адчуваючы набліжэнне канца, прабуюць прыкінуцца другімі, перамяніць скуру, абманыць пільнасць Аб'еднаных Нацый. Але тут абман немагчым, — усклікае дакладчык пад бурныя апладысменты зала. —І з фашысцкай змяёй здарыцца тое-ж, што здарылася ў крылоўскай байцы, дзе змяя ўгаварвала селяніна, каб ён паверыў яе раскаянню, што яна ў новай скуры, са старым пакончана.

«Хоть ты и в новой коже,
Да сердце у тебя все тоже—
И вышиб из соседки дух».

У заключэнне свайго даклада Н. Тіханаў гаворыць:

— Адзначаючы юбілей слаўнага народнага байкапісца ў нашай краіне, якая дасягнула сусветнай славы і велічы, напярэдадні поўнай перамогі над ворагам, напярэдадні канца чорнага гітлерызма, у дні гістарычных подвігаў нашага вялікага народа, мы не можам не прынесці дару нашага пракланення і любві цудоўнаму рускаму таленту, які так любіў народ, так жыў верай у яго будучае, так горача служыў яму!

Заключныя словы дакладчыка прысутныя пакрываюць доўга незмаўкаючымі апладысментамі.

Паэт Ісакоўскі чытае свае вершы, прысвечаныя памяці вялікага рускага байкапісца. Цёпла сустракаюць прысутныя паэта Лебедзева-Кумача, які выступіў з вершаванай прамовай.

З пранікнёнай прамовай і вершамі, прысвечанымі памяці вялікага рускага байкапісца, выступіў паэт Суркоў.

* * *

У заключэнне адбыўся вялікі канцэрт пры ўдзеле лепшых артыстычных сіл Масквы. (ТАСС)

Перадавікі аднаўлення сталіцы

Працоўныя сталіцы, натхнёныя гістарычным дакладам таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі, з кожным днём памнажаюць свае поспехі ў справе адбудовы роднага горада. На ўсіх участках кіпіць работа. Разбіраюць сцены і падмуркі, складаюць у штабялі цэглу, металічныя бэлькі, радыятары, трубы і розны металічны лом.

Асабліва многалюдна на аб'ектах у выходныя дні. Працоўныя большую палавіну свайго дня адпачынку аддаюць на адбудову сталіцы.

— Мы прыкладзем усе сілы і энергію, каб аднавіць цябе, родны Мінск, —так заяўляюць гаражане.

У масавыя нядзельнікі 12 і19 лістапада па Кагановіцкаму раёну горада Мінска працавала 78 арганізацый і прадпрыемстваў, 19 вулічных камітэтаў. У гэтыя дні выйшаў у полным саставе калектыў 5-й дыстанцыі пуці. Ён працаваў на адбудове 3-х дамоў. Асабліва вызначылася брыгада, якую ўзначальвае тав. Петрыкаў. Яна аднавіла падмурак, афарбавала драўляныя канструкцыі і пабяліла сцены ў жылым доме па Аўтадораўскай вуліцы.

Роўна па гудку выходзяць на нядзельнік рабочыя, інжынерна-тэхнічны персанал і служачыя вагонарамонтнага завода імені Мяснікова. Яны за апошнія два нядзельнікі многа зрабілі па аднаўленню свайго завода. Перакрыта 115 квадратных метраў даху, змантураваны 3 тоны металічных канструкцый, зашклёна 12 квадратных метраў акон, афарбавана і пабелена 70 квадратных метраў сцен.Складзена цагельная сцяна ў 7 кубічных метраў, на якой працаваў цяпер навучаны каменшчык тав. Чорнякоў. Ён норму выпрацоўкі выканаў на 175 процантаў. Усе кваліфікаваныя рабочыя працавалі на станках і выраблялі неабходныя дэталі для аднаўлення паасобных агрэгатаў прадпрыемства.

Па-ранейшаму ў ліку перадавых— работнікі Белгалоўснаба. Яны 19 лістапада склалі сцяну, дзе было скарыстана 6.600 цаглін, зрабілі абвязку знадворнага венца склада даўжыней у 56 метраў, збудавалі палатку для хавання грузаў, разабралі і склалі ў штабялі фасонных частак для злучэння каналізацыйных труб 10 тон.

Група рабочых вагоннага дэпо авалодала будаўнічымі спецыяльнасцямі. Заліўшчык букс тав. Асановіч кіраваў закладкай падмурка. Заліўшчыкі букс тт. Матусевіч і Мазалеўскі авалодалі пячной справай і на апошнім нядзельніку склалі ў дэпо печ.

На аднаўленных работах асабліва вызначылася комсамольска-маладзёжная брыгада (аддзяленне тэхагляда), якую ўзначальвае тав. Лебедзеў. Гэтая брыгада дзённую норму выканала на 220 процантаў.

Арганізавана працавалі на абудове сталіцы калектыў Народнага Камісарыята Аўтатранспарта, работнікі Упраўлення дзяржзабеспячэння, студэнты і выкладчыкі медінстытута.

Сярод вулічных камітэтаў — упередзе жыхары Калектарнай вуліцы.Тут многія хатнія гаспадыні адпрацавалі на адбудове горада па 145—150 гадзін. Сярод іх: Анна Хадачынская, Анастасія Наскова, Анна Мецялькова.

Побач з перадавымі калектывамі яшчэ ёсць і адстаючыя, дзе не арганізавана яшчэ як належыць работа па аднаўленню сталіцы. Да такіх адносяцца работнікі Облзаготзярно, Облмногапромсовета, радыёвузла, калектыў лесазавода.

Вл. ФЕДАРАЎ

Клопаты аб сем'ях франтавікоў

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). У Мазырскім гарадскім аддзеле дзяржаўнага забеспячэння састаяць на ўліку 893 сям'і франтавікоў: Усе яны акружаны клопатамі і ўвагай дзяржавы. 510 сямей штомесячна атрымліваюць дапамогу і пенсію на сумму ў 90.193 рублі. За апошні час 129 сем'ям аказана аднаразовая дапамога на суму ў 24.666 рублёў.

Вялікую дапамогу атрымліваюць сем'і франтавікоў промтаварамі і гароднінай. Ім выдана 1.700 насільных рэчаў, 1.630 метраў мануфактуры і 228 цэнтнераў гародніны і бульбы.

Пры гарадскім аддзеле дзяржаўнага забеспячэння створан спецыяльны фонд прадуктаў для аказання аднаразовай дапамогі сем'ям франтавікоў.

Зараз у горадзе праводзіцца месячнік па пашыву вопраткі для вучняў—дзяцей франтавікоў. Прамысловымі арцелямі горада будуць выраблены 200 пар абутку, 110 дзіцячых сукенак, 180 паліто і 20 касцюмаў.

НА ПЯЦЬ МЕСЯЦАЎ РАНЕЙ ТЭРМІНА

КАСЦЮКОВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). На пяць месяцаў раней тэрміна даў першую прадукцыю Касцюковіцкі спіртзавод. Самаадданa працавалі на аднаўленні роднага прадпрыемства каменшчыкі Пасюковы, брыгада меднікаў—Собалеў, Кузьмянкоў, Растургаеў, каваль Платонаў, малатабоец Стасеў, мантажнікі Гаравейкі, Пярэшкін і другія.

Высокую прадукцыйнасць працы ў час адбудовы завода паказаў механік тав. Трутко. Да вайны ён дзесяць год працаваў на гэтым прадпрыемстве. Зараз тав. Трутко энергічна працуе над забеспячэннем выканання вытворчай праграмы.

М. СІДАРОВІЧ.

ПЕРАНЯЦЬ ВОПЫТ ПЕРАДАВІКОЎ ЛЕСАЗАГАТОВАК

Па Барысаўскаму леспрамгасу план III квартала па нарыхтоўках і вывазцы лесаматэрыялу выканан на 102 процанты. Асобныя перадавыя лесаўчасткі паказалі высокія ўзоры ў сваёй рабоце. Адным з перадавых лесаўчасткаў з'яўляюцца Неманіцкі і Пруд-Баранскі. На гэтых лесаўчастках узорна расстаўлена рабочая і цягавая сіла, арганізавана звеннявая работа. На ўчастках праводзіцца вялікая палітычна-масавая работа сярод лесарубаў. Начальнікі ўчасткаў добра наладзілі абслугоўванне рабочых катлавым харчаваннем. У выніку гэтыя лесаўчасткі перавыканалі план III квартала і цяпер паспяхова выконваюць план IV квартала.

Неманіцкі лесаўчастак план III квартала па нарыхтоўках дроў, шпальніка і крапяжу для Данбаса выканаў на 110 процантаў, план IV квартала ім выканан ужо на 70 процантаў. Стаханаўцы — лесарубы Сымон Песляк, Райкевіч, Серафімовіч і другія простымі піламі сістэматычна выконваюць дзённае заданне на 130 процантаў.

Пруд-Баранскі ўчастак, які рыхтуе піламатэрыялы для лесазаводаў Барысава і аднаўлення гарадоў Барысава, Бабруйска, Гомеля, Магілева і сталіцы Беларусі Мінска, план III квартала выканаў на 130 процантаў і даў Радзіме 600 кубаметраў лесаматэрыялу звыш плана.

Стаханаўцам - лесарубам Мінлеспром аб'явіў падзяку і выдаў прэміі. Сярод іх Мікола Лапа, які за 24 дні выканаў 46 норм, Гічын—за 13 дзён выканаў 28 норм, Ермаловіч, які за 9 дзён выканаў 23 нормы, і другія.

Пруд-Баранскі лесаўчастак аказвае вялікую дапамогу калгаснікам Карсакоўскага сельсовета, якія найбольш пацярпелі ад фашысцкіх бандытаў, у пабудове жылых дамоў.

Але ёсць і такія лесаўчасткі, якія яшчэ як належыць не арганізавалі работы. Яны не толькі не выканалі абавязацельстваў, узятых у перадкастрычніцкім соцспаборніцтве, але сарвалі выкананне дзяржаўнага плана лесанарыхтовак і вывазкі. Гэта Зачысцкі і Слабодскі лесаўчасткі. На работу тут выходзяць з вялікім спазненнем, не арганізавана спаборніцтва, адсутнічае культурна-масавая работа.

Паводле рашэння абласных арганізацый са Смалявіцкага раёна для работы на ўчастку павінна быць мабілізавана 188 лесарубаў і 217 падвод. Аднак кіраўнікі Смалявіцкага раёна не выканалі гэтага рашэння; сарвалі мабілізацыю рабочай і цягавай сілы. На сёнешні дзень на гэтым участку працуюць толькі 72 лесарубы і 30 падвод.

К. ГЛУШАНІН.

Рашуча пакончыць з адставаннем

ВІЛЕЙКА. **(Кар. «Звязды»).** З краю ў край Маладзечанскай вобласці на дзесяткі кілометраў цягнуцца лясныя масівы прамысловага значэння. У дастатковай колькасці ёсць тут рабочая і цягавая сіла.

У чацвертым квартале вобласць павінна нарыхтаваць і вывезці каля 300 тысяч кубаметраў драўніны. Калі прыцягнуць усё працаздольнае насельніцтва для выканання гэтага дзяржаўнага задання, то на кожнага працаздольнага чалавека выпадзе нарыхтаваць не больш 2 кубаметраў, а па вывазцы — па 5 — 6 кубаметраў на кожнага каня.

У асноўным сельскагаспадарчыя работы ўжо закончаны. Усе спрыяючыя ўмовы для паспяховага выканання плана лесанарыхтовак і лесавывазкі ў наяўнасці. Але выкананне плана IV квартала стаіць пад яўнай пагрозай зрыву. Вілейлеспром, дзе дырэктарам тав. Панцялееў, квартальны план за паўтара месяца па нарыхтоўках выканаў на 15 проц., а па вывазцы толькі на 7. Юраціцкі леспрамгас гэтага трэста план вывазкі выканаў усяго на 2 проц., а нарыхтовак — на 5 процантаў.

Апрача Валожынскага леспрамгаса, які выканаў план нарыхтовак на 115 процантаў, усе леспрамгасы вобласці працуюць вельмі дрэнна. У Ільянскім раёне штодзённа павінны выходзіць на працу 40 лесарубаў і 56 возчыкаў. Старшыня выканкома райсовета тав. Басячэнка не прымае ніякіх мер для забеспячэння выканання гэтага плана, а абяцае разгарнуць работу толькі ў канцы квартала. Такое-ж становішча і ў Іўеўскім, Смаргоньскім, Куранецкім і іншых раёнах.

Кіраўнікі леспрамгасаў, як і кіраўнікі раёнаў, як належыць не заняліся мабілізацыяй рабочай і цягавай сілы. Леспрамгасы не забяспечаны тапарамі, піламі і іншымі прыстасаваннямі. У трэсце Вілейлеспром ёсць дзве майстэрні па выпуску колаў і саней. Але гэта прадукцыя не можа выпускацца з-за адсутнасці металічных аковак. Такое становішча нікога не турбуе.

Д. ВІННІКАЎ.

Тысячы кубаметраў лесу звыш плана

МАЗЫР, 22 лістапада. (БЕЛТА). Знатны лучкіст Васілевіцкага раёна Іван Шульга—лепшы стахановец Бабіцкага леспрамгаса. Ён выканаў месячнае заданне на 280 процантаў, нарыхтаваўшы 187 кубаметраў лесу. Яго таварышы па рабоце Козыр і Кузьмінскі штодзённа выконваюць нормы выпрацоўкі па 170 процантаў.

Лесарубы Коленскага ўчастка Ігнат Ліпскі, Нікалай Мірановіч, Ева Петрушкевіч, Надзея Ліцвен і другія, працуючы метадамі знатных лесарубаў, выконваюць нормы выпрацоўкі на 140 процантаў. Дзякуючы добрай рабоце лесарубаў і возчыкаў гэтыя раёны першымі ў вобласці датэрмінова выканалі план IV квартала па нарыхтоўках і вывазцы драўніны. Яны ўжо далі звыш плана тысячы кубаметраў лесу для чыгункі і крапяжу для шахт Данбаса.

У ЧЭСЦЬ ГАДАВІНЫ ВЫЗВАЛЕННЯ ГОМЕЛЯ

ГОМЕЛЬ. **(Кар. «Звязды»).** Рабочыя гомельскага электратэхнічнага завода з першых дзён вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў шырока разгарнулі соцыялістычнае спаборніцтва за хутчэйшае адраджэнне свайго прадпрыемства. Увесь калектыў працаваў, не пакладаючы рук. Стаханавец Павел Паўлоўскі ўпядрыў на заводзе станкі для насечкі напільнікаў, нарэзкі нажовак, штампы для кранштэйнаў і многае іншае. Датэрмінова заканчвалася аднаўленне вытворчых памяшканняў і абсталявання. У выніку вытворчая праграма III квартала заводам была выканана на 208 процантаў.

Натхнёны высокай ацэнкай правадыром гераічнай работы совецкага тылу, калектыў гомельскага электратэхнічнага завода звярнуўся да ўсіх рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых прамысловасці і транспарта горада Гомеля з заклікам уключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва, прысвечанае гадавіне вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Калектыў завода ўзяў на сябе абавязацельствы: цалкам скончыць аднаўленне ўсіх цэхаў завода да гадавіны вызвалення Гомеля; забяспечыць выпуск таварнай прадукцыі ў лістападзе ў памерах даваеннага ўзроўню; пачынаючы з снежня гэтага года і ў 1945 годзе выпускаць таварнай прадукцыі не менш 150 процантаў даваеннага ўзроўню. Гадавую вытворчую праграму па таварнай прадукцыі завод абавязваецца выканаць да 5 снежня 1944 года—да Дня Сталінскай Канстытуцыі. Апрача гэтага калектыў прадпрыемства ўзяў абавязацельствы: асвоіць на працягу лістапада масавы выпуск поўных камплектаў інструментаў для станцыйных механікаў сувязі; падрыхтаваць вытворчасць да выпуску з'ёмнага абсталявання і навучыць рабочых масавым прафесіям шляхам арганізацыі брыгад і індывідуальнага вучнёўства.

З месяца ў месяц гомельскі электратэхнічны завод перавыконваў планы і пашыраў вытворчасць. Ахоплены гарачым жаданнем падвоіць свае намаганні для дапамогі Чырвонай Арміі ў хутчэйшым разгроме ворага па франтах,—калектыў гэтага прадпрыемства ўзятыя на сябе абавязацельствы з чэсцю выканае.

ПІСЬМО ФРАНТАВІКОЎ НА ЗАВОД

Днямі калектыў завода імені Варашылава атрымаў пісьмо з фронта ад байцоў, сяржантаў і афіцэраў Н-скай вайсковай часці. У гэтым пісьме яны выказваюць падзяку калектыву за выхаванне былога рабочага завода—цяпер воіна доблеснай Чырвонай Арміі Х. Я. Валахянскага, які прапрацаваў на заводзе ў ліцейным цэху 21 год.

У пісьме пішацца: «Тав. Валахянскі, як комуніст і воін Чырвонай Арміі, чэсна выконвае ваш наказ і абавязак совецкага грамадзяніна соцыялістычнай Радзімы. Ён бязлітасна помсціць нямецка-фашысцкім захопнікам за разбураны горад Мінск, за родны завод, за слёзы сірот і гора мацярэй, за Совецкую Беларусь. За праяўленыя мужнасць і доблесць тав. Валахянскі ўзнагароджан ордэнам Чырвонай Звязды і медалямі «За отвагу», «За оборону Сталинграда» і зараз у чацверты раз прадстаўлен да ўрадавай узнагароды.

Совецкі тыл і фронт, совецкі народ і Чырвоная Армія,—пішуць франтавікі,—адзінае цэлае, і таму наша перамога пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў забяспечана.

Воіны звяртаюцца з заклікам да калектыва завода самаадданай працай дапамагаць франтавікам, хутчэй аднавіць свой завод і даваць як мага больш прадукцыі краіне і фронту.

Гэта пісьмо было зачытана на агульназаводскім мітынгу. Яно натхніла рабочых на новыя працоўныя подвігі і асабліва прыяцеляў тав. Валахянскага—ліцейшчыкаў завода.

У адказным пісьме калектыў завода расказаў воінскай часці аб сваёй рабоце. Не гледзячы на тое, што нямецкія каты ограбілі і часткова разбурылі завод і нанеслі яму страты больш чым на 12 мільёнаў рублёў, варашылаўцы праз два месяцы змаглі даць краіне і фронту прадукцыю.

«Таварышы чырвонаармейцы, сяржанты і афіцэры! Мы абяцаем вам, што прыкладзем усе сілы да няспыннага павелічэння колькасці і сістэматычнага паляпшэння якасці выпускаемай прадукцыі. На аснове шырока разгорнутага соцыялістычнага спаборніцтва, па пачыну Кузнецкага і Магнітагорскага камбінатаў, выканаем і перавыканаем наша заданне», — запэўнілі ў сваім пісьме варашылаўцы франтавікоў.

Л. КРАСІЛЬНІКАЎ,
парторг завода імені Варашылава.

НОВЫЯ ТОРФАПРАДПРЫЕМСТВЫ

Пачалося будаўніцтва аднаго з буйнейшых торфзаводаў «Лукское», Жлобінскага раёна, Гомельскай вобласці. Ужо закладзен фундамент галоўнага корпуса, пабудавана воданапорная вежа і кузня. Праведзены вялікія балотападрыхтоўчыя работы — зняцце ачосу, паглыбленне канаў.

У Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці будуецца торфзавод «Усяж». Ужо ўведзены сцены вытворчага корпуса, закончана будаўніцтва некаторых падсобных цэхаў.

Будуецца вялікі завод «Добейскі мох» у Віцебскай вобласці.

На будаўніцтва новых торфапрадпрыемстваў адпушчана каля двух мільёнаў рублёў.

(БЕЛТА).

ХАТНІЯ ГАСПАДЫНІ ДАПАМАГАЮЦЬ ЧЫГУНАЧНІКАМ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗІМЫ

МАГІЛЕЎ, 22 лістапада. (БЕЛТА). Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да зімы гаспадаркі Магілеўскага чыгуначнага вузла прымаюць хатнія гаспадыні. На вагонным участку актывістка тав. Гапонава арганізавала брыгаду з 30 хатніх гаспадынь. Брыгада ачысціла тэрыторыю ўчастка ад смецця, прывяла ў парадак многія запасныя часткі, сабрала некалькі тон металалому. Асабліва актыўна працуюць у брыгадзе хатнія гаспадыні Сцяпанава, Цыганкова і Дамброўская.

Зараз брыгада тав. Гапонавай узялася за пачынку спецвопраткі і пашыўку рукавіц.

Калінінскі шпіталь вярнуў да жыцця звыш трох тысяч знявечаных дзяцей, падабраных нашымі партызанамі ў акупіраваных немцамі раёнах.

На здымку: старэйшы кіраўнік шпіталя прафесар В. В. Успенскі гутарыць з выздараўліваючымі дзецьмі.

Фотахроніка ТАСС.

НАША СЯМ'Я

У сувязі з прысваеннем Анне Сяргееўне Доўгалавай звання «Маці-гераіня», карэспандэнт БЕЛТА звярнуўся да яе з просьбай расказаць аб сваёй сям'і. Вось што расказала слаўная патрыётка:

— Шчасліва і заможна жыла наша сям'я да вайны. Муж працаваў у калгасе старшым конюхам, а я— на птушкаферме. Штогод удваіх выпрацоўвалі мы звыш тысячы працадзён і за гэта атрымлівалі многа грошай і прадуктаў. Усяго было досыць. У нас быў добры, вялікі дом, свая гаспадарка, мелася карова, свінні, куры. Хоць не лёгка было мне, але я паспявала ўсюды — і за дзецьмі прыглядзець, і папрацаваць на славу ў калгасе і дома.

Не раз сям'я атрымлівала ад дзяржавы дапамогу. Старэйшыя дзеці вучыліся ў школе. Малодшыя хадзілі ў яслі.

Але вось пачалася вайна. З першых дзён муж быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Ніколі не запамятаю я тых жудасных дзён, калі гітлераўцы ўварваліся ў нашу вёску. Яны адабралі ў мяне ўсю жывёлу, хацелі адправіць дачок у Германію. Прышлося кінуць усё і разам з дзецьмі ісці ў лес. Калі-ж прышла дадому, то не пазнала тое месца, дзе стаяла наша сяло. Праклятыя фашысцкія варвары спалілі і разграбілі нашу вёску. Родная Чырвоная Армія, пад вадзіцельствам мудрага правадыра Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, зноў прынесла нам шчаслівае і радаснае жыццё.

Зноў я працую ў калгасе. За лета выпрацавала больш 100 працадзён і столькі-ж зрабілі мае старэйшыя дзеці. Дома ў нас зараз ні ў чым няма недахопу.

Днямі я даведалася, што Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР мне прысвоена званне «Маці-гераіня». Няма слоў, каб выказаць маю вялізарную радасць і гордасць. Я прыкладу ўсе сілы, каб вырасціць сваіх сыноў і дачок сапраўднымі патрыётамі нашай вялікай Радзімы.

УТУЛЬНА І ЧЫСТА

У другім дзіцячым доме горада Гродна выхоўваюцца 28 дзяцей-сірот. У многіх маленькіх совецкіх грамадзян бацькі пазверску забіты немцамі. Маці Юры Дудчанка забіта немцамі яшчэ ў 1943 годзе, таксама і ў Ніны Волкавай, Хадоры Пановай і многіх другіх. А Віця Шорын—партызан. Ён разам з дарослымі змагаўся з гітлераўцамі.

Чыста і ўтульна ў пакоі, дзе жывуць хлопчыкі. У пакоі прыгожа прыбраныя ложкі. На кожным з іх невялікая падушачка, беласнежная прасціня, ватная коўдра з чахлом і ручнік.

— Дзеці прызвычаіліся да строгага распарадку дня,—гаворыць загадчыца Л. Г. Дрыбус.—Яны самі прыбіраюць ложкі, кожную раніцу займаюцца фізкультурай.

У пакоі, дзе жывуць дзяўчаткі,—тая-ж самая абстаноўка, але на кожным кроку адчуваюцца дзявочыя клопаты. У пакоі прыгожа і ўтульна.

Весела і змястоўна правялі дзеці кастрычніцкія дні. Яны падрыхтавалі песні, танцы і дэкламацыі.

Г. ЯСЮЦІН.

У 2.250 хатах-чытальнях аднавілася работа

Штодзённа па вечарах у Замшынскай хаце-чытальні Лёзнянскага раёна Віцебскай вобласці збіраюцца маладыя і старыя калгаснікі. Сцены ўтульных светлых пакояў упрыгожаны лозунгамі, плакатамі, партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада. На відным месцы вісіць насценгазета. Кожны вечар комсамолка настаўніца тав. Сладкова праводзіць чытку свежых газет, журналаў і мастацкай літаратуры. З захапленнем займаецца моладзь у драматычным і харавым гуртках.

Вялікая культурна-асветная работа праводзіцца ў чаускім Доме культуры Магілеўскай вобласці. З усіх суседніх вёсак збіраюцца сюды калгаснікі. Цікавыя фотавыстаўкі «Аб Дні совецкай артылерыі», «Аб новых перамогах Чырвонай Арміі», «Аб зверствах нямецка-фашысцкіх бандытаў» наладжаны тут. Амаль кожны вечар у Доме культуры дэманстрыруюцца кінофільмы, арганізуюцца канцэрты самадзейнасці, праводзяцца лекцыі.

З наступленнем доўгіх зімніх вечароў такая-ж работа разгарнулася ва ўсіх іншых сельскіх культурна-асветных установах. Зараз у рэспубліцы аднаўлена 2.250 хат-чытален і 110 дамоў культуры.

(БЕЛТА).

КРЫЛОЎ І БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Беларуская літаратура заўсёды расла і развівалася ў сувязі і пад уплывам рускай класічнай літаратуры. І Крылоў, як заснавальнік народнага напрамку ў рускай літаратуры, як стваральнік нацыянальнай рускай байкі, для беларускай новай літаратуры, якая не знала класіцызма і рамантызма, а пачала сваё развіццё пад сцягам народнасці і рэалізма, — мае вялікае значэнне і самае блізкае дачыненне. Гэтае непасрэднае дачыненне і ўплыў праявіўся перш за ўсё ў народным напрамку нашай літаратуры, у крылоўскім прынцыпе народнасці. Нашы класікі, стваральнікі народнай беларускай літаратуры Багушэвіч, Максім Багдановіч, Ядзвігін Ш., Янка Купала, Якуб Колас вучыліся ў Крылова народнай прастаце ў паэзіі, здзейснялі крылоўскія прынцыпы зліяння літаратуры з жыццём народа, літаратурнай мовы—з мовай народа. Ужо той факт, што многія беларускія паэты перакладалі на беларускую мову байкі Крылова, а таксама і самі прабавалі пісаць арыгінальныя байкі, маючы на ўвазе Крылова, як узор, гаворыць аб непасрэднай сувязі Крылова з беларускай літаратурай. Першы вялікі нацыянальны паэт беларускага народа Ф. Багушэвіч перакладаў на беларускую мову байкі Крылова, а таксама сам, відаць пад уплывам рускага байкапісца, пісаў арыгінальныя байкі. Вось, напрыклад, цудоўны пераклад Багушэвіча байкі Крылова «Свіння пад дубам»:

«Свіння, наеўшыся пад дубам жалудзей,
Заснула смагла, прачасалася,
І так, як іншы між людзей,
Лычом карэнняў дакапалася.
Карэнні рвё, капае ямы...
«Што робіш?—з дуба Сокал кажа:—
Гэтак ты зглумішь і дуб самы,
Як падкапаеш, ссохне, ляжа».
«Дык што! Няхай сабе хоць згіне,
А-бы мне жалудоў пад'есці,
Каторых надта любяць свінні».
Зарухкала свіння ўрэшце.
Дуб Сокалу так гамоне:
«Свіння свіннёй, і заўсягды:
Яна не відзе, што на мне
Гадуюцца ёй жалуды».

Арыгінальная байка «Воўк і Авечка» Багушэвіча пераклікаецца агульным ідэйна - мастацкім зместам з байкай «Волки и овцы» Крылова. Гэтыя байкі збліжае між сабой тонкая народная іронія, выказаная і Крыловым і Багушэвічам па адрасу царскіх законаў і крыўдзіцеляў народа.

Беларуская пісьменніца і даследчыца канца XIX і пачатку XX стагоддзя Марыя Косіч шмат баек Крылова пераклала на беларускую мову і выдала іх асобнай кніжкай пад загалоўкам: «Пералажэнне некаторых басень Крылова на беларускае нарэчэе» (Чарнігаў, 1903 год). Тут перакладзены байкі «Ворона и лисица», «Волк и кукушка», «Листы и корни», «Сердобольная лисица», «Лебедь, щука и рак», «Василёк», «Крестьянин и лисица», «Орел и пчела», «Квартет», «Кот и повар». Да перакладаў і пераробак часта далучаюцца мараль і вывады, маючыя актуальны мясцовы характар. Вось для ўзора пераклад байкі «Рак, лебедь и щука»:

«Раскажу вам, братцы, штуку
Пра рака, лебедзя і шчуку,
Як яны вазіць на лінію
Каменння падляклісь,
Наклалі воз і усе трое
У яго ўпрагліся.
Кожан цягне сваім трахтам:
Лебедзь прэ у паднябессе,
А рак не хоча так:
Ён кажа, то не ў лад,
Трэба назад.
Ну шчука на сваім стаіць!
Вадой, кажа, дастаўка легшы.
Тапталіся доўга каля воза
Аднача паміж іх
Ніхто там раду не знайшоў.
Я плюнуў да і пайшоў.
А воз яшчэ пасюль вязуць
На лініі яшчэ й цяперацька
Таго каменння ждуць».

Алегарычныя апавяданні Ядзвігіна Ш. «Сакатушка», «Сіло», «Павук» па свайму мастацкаму характару нагадваюць байкі Крылова. Мастацкая характарыстыка алегарычнага вобраза вароны з байкі «Варона і чыж» М. Багдановіча пераклікаецца з мастацкай характарыстыкай вароны з аднаіменнай байкі Крылова. Лісліваець, пустая фанабэрыстасць вароны ў Багдановіча апісваецца так:

«Скажы, ці я падобна да арла?»
— Зусім арол — адказвае чыж
Вароне, клятай з клёна.
«Ну, то-ж бо то! Глядзі-ж!
З ласкаваю гразьбой пракаркала
І паляцела варона стуль далей.
Байкі народнага паэта Янкі Купалы «Мікіта і валы», «Два мужыкі і глушэц», «Асёл і навука», «Ігнат і п'яўкі» па сваёй мастацкай дасціпнасці, тонкай і народнай іроніі, каларытнасці, патрыятызму захоўваюць у сабе крылоўскую манеру і палітычную страснасць. Вось, напрыклад, байка Купалы «Мікіта і валы»:

Ці летась ці залетась, тут ці там—
Штось мне няўцям,
Ляшыў Мікіта
Жыта.
І, як на злосць, яму адну
Валы скрывілі баразну.
Вось ён і стаў (хоць добра ішлі ўсё лета)
Ім вытаварываці гэта:
«Я вас,—так кажа, — як магу
І сцерагу.
Сам недасплю,
А вас кармлю:
Трасяначкай зімою,
Улетку траўкай лугавою,
Штодня вадзіцы
Даю з крыніцы —
А вы што мне?—Бязбожна
Крыўляеце барозны,
Хоць і не можна
Усё такое»...
Валы пад тое:
— «Мы-б мо' і не крыўлялі,
Каб павадоў, ярма і пуг не зналі».

Наш народны паэт, жывы класік беларускага мастацкага слова, Якуб Колас яшчэ ў той час, калі ён толькі пачынаў чытаць мастацкія творы, захапляўся Крыловым, з вялікай любоўю і пашанай адносіўся да яго творчасці. Колас у сваёй аўтабіяграфіі, напісанай у 1921 годзе, гаварыў паступнае: «Крылоў доўгія годы быў маім богам. Поўны зборнік яго баек я вывучыў чуць не напамяць, з гэтымі творамі вялікага генія я доўгія часы не разлучаўся. Мае першыя літаратурныя пробы былі байкі, якія я пачаў пісаць з 12—13 гадоў».

Гэтае прызнанне народнага паэта знамянальна для беларускай літаратуры і павучальна для нашых паэтаў і пісьменнікаў. Творчасць Крылова была для Коласа цэлай школай, а сам Крылоў быў вялікім настаўнікам нашага паэта. Хоць першыя спробы пяра, звязаныя з непасрэдным уплывам Крылова, да нас і не дайшлі, дзесьці, мабыць, загінулі, аднак, той факт, што для нашага паэта Крылоў быў богам, згодна ўласнага прызнання, — не прайшоў бясследна, ён пакінуў свой прыгожы след у творчасці Коласа. І гэты след плённых уплываў Крылова на Коласа самабытна адзначыўся непасрэдна на алегарычных апавяданнях Коласа, своеасаблівых байках у прозе, змешчаных у зборніку «Казкі жыцця», — гэтай мудрай мастацкай кніжцы, напісанай таленавітым вучнем народнага мудраца І. А. Крылова.

З беларускіх паэтаў і пісьменнікаў новага пакалення найбольш таленавітым і паслядоўным вучнем І. А. Крылова стаў Кандрат Крапіва. На першых кроках свайго творчага шляху Крапіва шчыльна следаваў за сваім вялікім настаўнікам і пісаў байкі, якія, трэба падкрэсліць, настолькі былі арыгінальны і самабытны, што некаторыя з іх па мастацкай якасці можна смела паставіць у адзін рад з байкамі Крылова, а таксама вызначыць іх, як шэдэўр совецкай байкі не толькі ў беларускай літаратуры, а і ў літаратуры Совецкага Саюза.

У той перыяд, калі Крапіва пісаў байкі, ён называўся чытачамі беларускім Крыловым. Гэта назва была высокай ацэнкай баек Крапівы. Крапіва не быў эпігонам, не паўтараў Крылова і механічна не падражаў яму: ён таленавіта развіваў творчыя прынцыпы крылоўскай байкі ў своеасаблівых нацыянальных і палітычных умовах, якія, адлюстраваўшыся ў байках Крапівы, зрабілі іх арыгінальнымі і самабытнымі. Вось, напрыклад, байка Крапівы «Жаба ў каляіне» (1927 год). Яна па свайму мастацкаму характару, тонкай, дасціпнай іроніі і сарказму блізка стаіць да байкі Крылова «Лягушка и вол», аднак, ні ў чым не паўтарае яе, і з'яўляецца выключна арыгінальнай. Блізкасць гэта праяўляецца ў мастацкай характарыстыцы алегарычнага вобраза. Гарапаслівая жаба з байкі Крылова хацела ў паўнаце з валом зраўнацца; яна «пыхтела да пыхтела, и кончила моя затейница на том, что, не сравнявшися с волом, с натуги лопнула и околела».

У байцы Крапівы жаба таксама ўзяла на сябе непасільную справу: абярнуць воз, які ехаў па дарозе і таму перашкаджаў жабе:

Апанавала жабу злосць
І падказаў ёй жабін розум:
«Ага, ну, ну!
Ты пажыві яшчэ хвіліну, —
Вось толькі сяду ў каляіну
Плячом пад кола таржану
І к чорту воз перавярну.
Тады—капут, і ты мяне не зловіш,
Бо галаву, напэўна, зломіш.
І—скок жабоцька смела
Ды ў каляіну села.
Тут колам — хрась...
І кроў і гразь...
. . . . . .
Пад кола, жаба, не падлазь.

І мараль гэтай байкі фармуліруецца Крапівой па-Крылоўскі коратка, проста, па-народнаму ясна, з адпаведнай палітычнай завостранасцю, актуальнай накіраванасцю:

Ці не такі-ж і кожнай жабы лёс,
Што пнецца на-хаду кульнуць совецкі воз.

З такім-жа мастацкім і палітычным пакалам напісаны байкі Крапівы «Сука ў збане», «Сава, асёл ды сонца», «Вол і авадзень», «Мандат», «Дыпламаваны баран», «Ганарысты парсюк», «Дзед і баба», «Сваяўство», «Кувада» і інш. Хоць гэтыя байкі Крапівы, як і іншыя, не маюць непасрэдных дотыкаў з байкамі Крылова, бо яны глыбока арыгінальныя, — усё-ж у іх жыве бяссмертны дух вялікага рускага байкапісца. Як для Крапівы, а таксама іншых нашых паэтаў, пісаўшых байкі, Крылоў быў крыніцай, з якой чэрпаліся вобразы, алегорыі, сюжэт, склад верша, мараль, сэнтэнцыі для беларускіх баек.

Міх. ЛАРЧАНКА.



На Будапешцкім напрамку.
Совецкая артылерыя перапраўляецца праз раку Тіса.

Фотахроніка ТАСС.

Маршалу ТІТО прысвоена званне Народнага Героя

БЕЛГРАД, 22 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Тап Юг паведамляе, што пастановай прэзідыума Антыфашысцкага Вечэ Народнага Вызвалення Югаславіі Маршалу Іосіпу Броз-Тіто прысвоена званне Народнага Героя.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 22 лістапада. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца:

У Галандыі пасля вызвалення Хеленавеена саюзныя войскі прасунуліся на 4 мілі на ўсход ад гэтага горада. На паўднёвым усходзе ад яго, паблізу Масврэе, прадаўжалася прасоўванне войск саюзнікаў, якія знаходзяцца ў 4 мілях ад Венло.

Прадаўжаюцца жорсткія баі ў сектары Гейленкірхена (Германія).

Саюзныя войскі праніклі ў Эшвейлер. Вораг аказвае моцнае супраціўленне на паўночным усходзе ад Штольберга і ў паўночнай частцы Гюртгенскага лесу. Занят Гейстэрн (у 2-х мілях на паўночным усходзе ад Грэсеніха). Іншыя атрады саюзных войск прасунуліся за гэты горад.

У Мецэ праціўнік прадаўжае аказваць супраціўленне на востраве Сосі.

На паўднёвым усходзе ад Меца саюзныя войскі дабіліся поспехаў на поўначы ад Фальценберга. Вызвален Элімер (у 10 мілях на паўднёвым усходзе ад Фальценберга), а крыху на поўдзень саюзнікі занялі гарады, Торшвіль і Эншвіль (Эшвейлер). Пераадольваючы слабае супраціўленне праціўніка, танкі і пяхота саюзнікаў прасунуліся на адлегласць 8 міль на ўсходзе ад Сарэбура на шырокім фронце. Саюзныя войскі пераадолелі германскую абарону на ўчастку Савернскага праходу праз Вагезы. Вораг, які хутка адступаў, пакінуў многа снаражэння; у ходзе свайго наступлення саюзнікі вызвалілі вялікую колькасць вёсак на плошчы больш 100 квадратных міль.

Авіяцыя саюзнікаў аказвала падтрымку наступаючым войскам і наносіла ўдары па ваенных аб'ектах праціўніка ў паўночнай і ўсходняй Галандыі і ў заходняй Германіі.

ЛОНДАН, 22 лістапада. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што на захадзе ад Форлі англійскія часці 8-й арміі авалодалі ўмацаванай вёскай Кастыльоне. Далей на захад часці 8-й арміі, зламаўшы ўпорнае супраціўленне праціўніка, зноў авалодалі Монтэ Фортыно, прасунуліся на адну мілю і авалодалі важным узвышшам Монтэ Піано. У гэтым сектары прадаўжаюцца цяжкія баі. Амерыканскія, англійскія і індыйскія часці 5-й арміі зноў адбілі некалькі моцных атак праціўніка.

21 лістапада авіяцыя саюзнікаў зрабіла налёты на скапленні войск праціўніка і на яго камунікацыі ў Югаславіі і паўночнай Італіі».

* * *

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца:

У сектары Венло (Галандыя) прадаўжаецца прасоўванне саюзнікаў. Саюзныя часці занялі Маасврее і знаходзяцца менш чым у 4-х мілях ад Венло. На захад ад Рурмонда войскі саюзнікаў выйшлі да ракі Маас насупроць горада.

У сектары Гейленкірхена (Германія) войскі саюзнікаў, якія прасоўваюцца да ракі Роер, занялі Гофен.

У раёне на паўночны ўсход ад Эшвейлера (Германія) баі ідуць у пункце Лон. Дырвіс і Эшвейлер ачышчаны ад праціўніка.

На паўночны ўсход ад Тіонвіля (Францыя) бронетанкавыя часці саюзнікаў прасоўваюцца на поўнач на германскай тэрыторыі ў раёне Сунсдорфа.

Мец поўнасцю ачышчан ад праціўніка, але некаторыя аддаленыя форты яшчэ прадаўжаюць супраціўленне. На поўнач ад Фальценберга войскі саюзнікаў прасунуліся а на ўсход і паўночны ўсход ад Дзьеза саюзнікі дасягнулі Рорбаха, Алгвейлера і Вісінга (Латарынгія). Перадавыя часці знаходзяцца ў аколіцах Мітэргейма (Латарынгія).

Войскі саюзнікаў уступілі на раўніну Ніжняга Эльзаса і знаходзяцца ў 20 мілях ад Страсбурга і Рэйна. Занят Савернскі. Перадавыя часці прасоўваюцца таксама і на другіх участках гэтага сектара. Саюзнікі ўвайшлі ў Сен-Дзье і значна прасунуліся на ўсход ад ракі Мерт.

У раёне Бельфорскага карыдора адбіты жорсткія контратакі праціўніка. Большая частка Бельфора ачышчана. Вызвален таксама Мюлуз. Непрыяючае надвор'е перашкаджала дзеянням авіяцыі.

ЛОНДАН, 23 лістапада. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што ў Італіі, на поўдні ад Фаенца, часці 8-й арміі значна прасунуліся. Індыйскія часці 5-й арміі авалодалі некалькімі важнымі вышынямі на поўначы ад горада Модыльяна. На другіх участках фронта змяненняў у пазіцыях войск саюзнікаў не адбылося.

Буйныя злучэнні цяжкіх бамбардыроўшчыкаў у суправаджэнні знішчальнікаў 22 лістапада зрабілі налёт на аб'екты ў раёне Мюнхена і на чыгуначныя камунікацыі ў Паўдневай Германіі, Аўстрыі і Паўночнай Італіі. Мінулай ноччу англійскія цяжкія і сярэднія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на чыгуначныя аб'екты ў Венгрыі.

ЧЛЕН ШВЕДСКАГА РЫКСДАГА ПАТРАБУЕ РАЗРЫВУ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ АДНОСІН З ГЕРМАНІЯЙ

ГЕТЭБОРГ, 22 лістапада. (ТАСС). 20 лістапада ў Гетэборгу адбыўся мітынг, на якім выступіў з прамовай член рыксдага (шведскі парламент) Фрэдэрык Стрэм. Ён патрабаваў прызнання вызваленчай барацьбы нарвежцаў і датчан справай шведскага народа. Стрэм настойваў таксама на тым, каб Швецыя адмовілася прадстаўляць інтарэсы Германіі ў іншых краінах і разарвала дыпламатычныя адносіны з Германіяй. Прысутныя горача віталі выступленне Стрэма. Гетэборгскія газеты змяшчаюць падрабязныя справаздачы аб яго прамове. Газета «Арбетар тыднінген» апублікавала змест прамовы Стрэма пад буйным загалоўкам «Дыпламатычныя адносіны з Германіяй павінны быць парваны».

З'ЕЗД АНТЫФАШЫСЦКАЙ МОЛАДЗІ СЕРБІІ

БЕЛГРАД, 19 лістапада (ТАСС). У прысутнасці двух тысяч дэлегатаў у Белградзе 16 лістапада адкрыўся першы з'езд антыфашысцкай моладзі Сербіі.

З'езд адкрыўся выступленнем Маршала Іосіпа Броз-Тіто, які адзначыў заслугі сербскай моладзі ў вызваленчай барацьбе. «У ваеннай галіне, — указаў Тіто, — мы ўжо прайшлі кропку максімальных намаганняў— цяпер з намі Чырвоная Армія, цяпер ёсць поўмільённая народна-вызваленчая армія народаў Югаславіі якая ўсё лепш і лепш узбройваецца, цяпер з намі нашы вялікія саюзнікі. Але перад намі стаіць задача будаўніцтва нашай разбуранай краіны».

«Мы не хочам больш,—дадаў Маршал Тіто,—такой Югаславіі, якой яна была да сучаснай вайны. Мы хочам мець квітнеючую краіну...» Тіто скончыў прамову здравіцай у чэсць «моладзі Югаславіі і брацкай адзінай федэратыўнай Югаславіі».

З'езд прыняў прывітальныя тэлеграмы таварышу Сталіну, прэзідэнту Рузвельту і Уінстону Чэрчыллю.

АДНАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРНА-ГАСПАДАРЧАГА ЖЫЦЦЯ НА АСТРАВАХ БРАЧ І КОРЧУЛА

БЕЛГРАД, 23 лістапада. (ТАСС). Радыёстанцыя «Слабодна Югаславія» паведамляе, што пасля вызвалення ад нямецкіх акупантаў югаслаўскіх астравоў Брач і Корчула (ля адрыятычнага ўзбярэжжа Югаславіі) на іх хуткімі тэмпамі аднаўляецца нармальнае жыццё. На востраве Брач адкрыта 21 школа, у якіх прыступілі да заняткаў 1.200 вучняў. На востраве Корчула функцыянуюць 24 школы, у якіх займаюцца 1.383 школьнікі. Камітэты народнага вызвалення забяспечылі вучняў школьнымі дапаможнікамі.

На востраве Брач разгарнуліся работы па аднаўленню разбуранай акупантамі гаспадаркі. Арганізавана лоўля рыбы. Аднаўляюцца каапаратывы. Рамантуюцца пашкоджаныя дамы.

АНТЫГІТЛЕРАЎСКІЯ ЛІСТОЎКІ Ў БЕРЛІНЕ

СТАКГОЛЬМ, 22 лістапада. (ТАСС). Шведская газета «Афтонбладэт» паведамляе, што ў апошнія дні на сценах дамоў у Берліне было расклеена многа лістовак, у якіх было напісана: «20 лістапада 1942 года пачалася ліквідацыя 6-й арміі ў Сталінградзе, якой афяравалі па загаду Гітлера. Цяпер пачынаецца ліквідацыя Гітлера і яго зграі, якія хочуць афяраваць нямецкім народам. Германія не павінна загінуць, як 6-я армія ў Сталінградзе. Таму далоў Гітлера!»

КУЗЬМА ЧОРНЫ

Беларуская совецкая літаратура і ўся совецкая грамадскасць панеслі велізарную ўтрату. Пасля цяжкай працяглай хваробы памёр адзін з буйнейшых нашых пісьменнікаў Кузьма Чорны (Мікола Карлавіч Раманоўскі).

Нарадзіўся Кузьма Чорны ў беднай сялянскай сям'і ў 1900 годзе ў мястэчку Цімкавічы, Капыльскага раёна, Мінскай абласці. Сын батрака, Кузьма Чорны ўзняўся з самых глыбін народа і прынёс у літаратуру яго вялікую, светлую душу. Ён адносіцца да таго пакалення пісьменнікаў, што прышло ў літаратуру хутка пасля Кастрычніцкай рэволюцыі, якая абудзіла магутныя творчыя сілы нашага народа. Глыбокае веданне душы працоўнага чалавека—селяніна, батрака, рабочага, інтэлігента—бачым мы ў яго выдатных раманах, аповесцях, апавяданнях. З вялікай любоўю і чуласцю падыходзіць Кузьма Чорны да чалавека і ў сваіх творах раскрывае перад намі ўсё багацце яго пачуццяў і глыбіню думак. А што знаходзіць не вартым высокай годнасці чалавека, тое ён выстаўляе на суд, на асмеянне, адмятае, як мякіну, ад чыстага зерня.

Прачытаўшы яго твор, чытач пранікаецца большай пашанай да чалавека, навучаецца распазнаваць у людзях тое добрае і благароднае, што часамі хаваецца пад вопкавай абалонкай звычайнасці. Вось чаму творы Кузьмы Чорнага карыстаюцца гарачай і заслужанай любоўю нашага совецкага чытача.

Дваццаць год напружанай творчай працы аддаў Кузьма Чорны свайму народу. Некалькі зборнікаў цудоўных апавяданняў, дзесяткі буйных твораў і сярод іх такія, як раман «Трэцяе пакаленне», п'еса «Бацькаўшчына», аповесць «Лявон Бушма» — вось той велізарны ўклад, які ўнёс пісьменнік у беларускую літаратуру. Ён узняў беларускую мастацкую прозу на новую вышэйшую ступень яе развіцця і стаў выдатным пісьменнікам не толькі ў беларускай, але ва ўсёй совецкай літаратуры.

Многа пяжкіх выпрабаванняў выпала на долю Кузьмы Чорнага за яго жыццё, але ні разу ён пад ударамі лёсу не паў духам, не пахіснуўся, не азлабіўся душой. Пераконаны аптыміст, ён ішоў намечаным шляхам з цвёрдай верай у вялікую будучыню нашай совецкай Радзімы і ўсяго чалавецтва.

Самым цяжкім горам для пісьменніка-патрыёта была вымушаная разлука з любай Беларуссю, на якую наваліліся гітлераўскія орды. З гораччу і болем у сэрцы пакідаў ён родную зямлю і ахоплены полымем Мінск. Шмат гарачых і гнеўных радкоў, накіраваных супроць нямецкіх катаў, вышла з пад яго пяра. Дышучыя помстай словы пісьменніка даходзілі да сэрца беларускага народа і натхнялі лепшых яго сыноў на барацьбу з лютым ворагам.

Вызваленне роднай Беларусі ад фашысцкай нечысці і зварот на радзіму былі для пісьменніка велізарнай радасцю.

У роднай краіне, сярод блізкіх людзей у яго нараджаліся новыя творчыя замыслы, якімі ён часта дзяліўся са сваімі сябрамі, але якім не суджана было поўнасцю здзейсніцца.

Чалавек вялікага сэрца, сапраўдны пісьменнік народа, Кузьма Чорны ўсе свае творчыя сілы, увесь свой талент аддаў народнай справе, той велізарнай творчай працы народа, якая пад кіраўніцтвам нашай мудрай Камуністычнай партыі ператварыла нашу краіну ў адну з перадавых рэспублік Совецкага Саюза. У суровыя і грозныя дні Вялікай Айчыннай вайны Кузьма Чорны ўступае ў рады партыі большэвікоў, якая арганізавала сакрушальны адпор лютаму ворагу і вядзе народ да канчатковай перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Кузьма Чорны да апошняй хвіліны свайго жыцця быў верным сынам свайго народа, большэвіцкай партыі, сваёй Радзімы. За дзейсны ўдзел у развіцці партызанскага руху на Беларусі совецкі ўрад узнагародзіў пісьменніка ордэнам Чырвонай Звязды і медалём «Партызану Айчыннай вайны 1 ступені».

Не дажыў пісьменнік-патрыёт да блізкай урачыстасці — да нашай канчатковай перамогі над заклятым ворагам. Няма больш сярод нас выдатнага пісьменніка і чалавека Кузьмы Чорнага. Назаўсёды захаваем мы ў нашым сэрцы светлую памяць аб ім, а яго няўміручыя таленавітыя творы будуць служыць яму помнікам у вяках і пакаленнях.

Гарбуноў, Ільюшын, Якуб Колас, Міхась Лынькоў, Пестрак, Крапіва, Куляшоў, Танк, Броўка, Глебка, Сурноў, Фадзеў, Твардоўскі, Ісакоўскі, Пятро Панч, Масашвілі, Бахмецьеў, Самуцін, Фешчанка, Луцэвіч, Гурскі, Клімковіч, Вольскі, Кучар, Маўр, Якімовіч, Панчанка, Барысенка, Машара, Астрэйка, Лужанін, Бялевіч, Краўчанка, Модэль, Раманович, Стаховіч, Ларчанка, Крысько, Садоўскі, Платнер, Лупсякоў, Фінкель, Грубіян, Смоляр, Александроўская, Глебаў, Уладамірскі, Ждановіч, Ржэцкая, Рахленка, Платонаў, Грыгоніс, Ільінскі, Малчанаў, Сяргейчык, Алер, Стэльмах, Сяргеева, Ахрэмчык, Зайцаў, Бембель, Азгур, Грубэ, Гусеў, Багатыроў, Цікоцкі, Аладаў, Пукст, Іваноў, Саннікаў, Корш-Саблін, Садковіч.

Пахаванне памёршага пісьменніка Кузьмы Чорнага (Раманоўскага Н. К.) адбудзецца 24 лістапада.

Вынас цела нябожчыка з будынка Першага Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра ў 2 гадзіны дня.

Камісія па арганізацыі пахавання.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

25 лістапада ў памяшканні Беларускага Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра адбудзецца гарадская нарада брыгадзіраў, працуючых на аднаўленні горада Мінска.

Пачатак у 7 гадзін вечара.

Уваход па запрашальных білетах. Білеты ў гаркоме і райкомах КП(б)Б.

МІНСКІ ГАРКОМ КП(б)Б.

На Совецкаму Саюзу

МЕТАЛУРГІ МАГНІТКІ ДАЮЦЬ ЗВЫШПЛАНАВУЮ СТАЛЬ

Дастойна адзначылі Дзень артылерыі металургі Магніткі. У лістападзе яны дасягнулі новага росту вырабу сталі. Асабліва добра працуюць сталеплавільшчыкі. Напярэдадні свята яны далі самую высокую колькасць сталі ў лістападзе. Лепшыя паказальнікі маюць мартэнаўцы 1-га пэха, дзе начальнікам тав. Воранаў, якія выканалі гадавы план. У асобы фонд Галоўнага Камандавання Чырвонай Арміі яны далі 1.300 тон метала звыш гадавога задання.

(ТАСС).

ЛАТВІЙСКІЯ РАБОЧЫЯ АДНАВІЛІ ФАБРЫКУ ІЛЬНЯНЫХ ТКАНІН

У Рыге, ва ўрачыстай абстаноўцы пушчана буйнейшая ў Латвіі фабрыка ільняных тканін. Яна працуе на ўласнай электраэнергіі.

У першыя дні пасля вызвалення Рыгі калектыў рабочых, інжынераў і служачых абавязаўся стварыць уласную энергетычную базу і ў вайкарацейшы тэрмін пусціць фабрыку. Днём і ноччу механікі рамантавалі кацельныя, аднаўлялі турбагенератары. Рабочыя рамантавалі і збіралі абсталяванне ў цэхах. Жанчыны ачышчалі склады і двор. У назначаны дзень сілавая станцыя фабрыкі дала ток і фабрыка запрацавала. Яна выпусціла першыя сотні метраў высокакаснага ільнянога палатна.

(ТАСС).

ВЫДАТНЫ ПРЫКЛАД ХАТНЯЙ ГАСПАДЫНІ ГУСЬКО

ВЛАДЗІВАСТОК. У горадзе Варашылаве-Усурыйскім шырокай папулярнасцю карыстаецца хатняя гаспадыня Ірына Захараўна Гусько. З першых дзён вайны гэта пажылая жанчына выступае ў ліку арганізатараў збору падарункаў байцам і афіцэрам Чырвонай Арміі. Апрача таго, Гусько сама ў вольны час вяжа цёплыя шарсцяныя рукавіцы і наскі. З пачатку вайны яна ўжо звязала і адправіла на фронт каля 1.500 пар рукавіц і наскоў.

КРЫЛОЎСКІЯ ПАШТОВЫЯ МАРКІ

Народны Камісарыят Сувязі СССР выпускае серыю паштовых марак, прысвечаных стагоддзю з дня смерці І. А. Крылова. Яна складаецца з двух марак карычневага і зялёнага колераў коштам у 30 кап. і ў 1 рубель. На марках—партрэт вялікага байкапісца.

У бліжэйшыя дні новая серыя паступае ў продаж.

(ТАСС).

ЮБІЛЕЙНАЯ НАВУКОВАЯ СЕСІЯ ЛЕНІНГРАДСКАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЛЕНІНГРАД. Тут адкрылася юбілейная навуковая сесія, прысвечаная 125-годдзю Ленінградскага універсітэта. У зале Філармоніі сабраліся выдатныя вучоныя Ленінграда і раду гарадоў краіны.

Сесія прадоўжыцца да 8 снежня. На пленарных і секцыйных паседжаннях будзе заслухана каля 200 дакладаў амаль па ўсіх галінах ведаў. Дакладчыкамі выступяць 207 навуковых работнікаў, з іх 32 акадэмікі і члены-карэспандэнты Акадэміі навук СССР, 7 заслужаных дзеячоў навукі, 120 прафесараў і доктараў навук. Сесія дасць агляд развіцця навук у Пецербургскім-Ленінградскім універсітэце за 125 год.

ВЫДАННЕ КАМІЮНІКЕ ПОЛЬСКА-СОВЕЦКАЙ НАДЗВЫЧАЙНАЙ КАМІСІІ

У Дзяржаўным выдавецтве палітычнай літаратуры выйшла асобным выданнем Камюніке Польска-Совецкай Надзвычайнай Камісіі па расследванню злачынстваў немцаў, учыненых у лагеры знішчэння на Майданеке ў г. Любліне.

Брашура ілюстравана фотаздымкамі пячэй крэматорыя, у якіх гітлераўскія каты спальвалі свае афяры, рэчавых складаў лагера, у якіх знаходзілася больш 800 тысяч пар абутку спаленых і расстраляных зняволеных.

Тыраж брашуры—100 тысяч экземпляраў.

ПОСПЕХІ ГАРНЯКОЎ КАМБІНАТА «МАСКВАВУГАЛЬ»

СТАЛІНАГОРСК. Камбінату «Масквавугаль» уручан пераходны Чырвоны Сцяг Дзяржаўнага Камітэта Абароны за пасяховую работу ў кастрычніку. На сходзе, прысвечаным гэтай падзеі, удзельнічала 700 прадстаўнікоў шахт Мосбаса.

Прымаючы сцяг ад двойчы Героя Совецкага Саюза генерал-маёра Фесіна, начальнік камбіната тав. Оніка заявіў:

— У новагоднім пісьме таварышу Сталіну шахцёры камбіната абяцалі падняць здабычу вугалю да снежня бягучага года на 20 процантаў супроць снежня мінулага года. Гэта абавязацельства выкапана датэрмінова. За 10 месяцаў здабыча паліва павялічана на 22 процанты. Гарнякі Падмаскоўя горача падтрымліваюць патрыятычны пачын магнітагорскіх і кузнецкіх металургаў і бяруць у сувязі з гэтым абавязацельствы: гадавы план здабычы завяршыць да Дня Сталінскай Канстытуцыі — 5 снежня і даць звыш плана 700.000 тон паліва.

Сёння ў кінотэатрах:

КІНОТЭАТР „ПЕРШЫ"
«ДЖУНГЛІ»

КІНОТЭАТР „РАДЗІМА"
«ДЖОРДЖ З ДЗІНКІ ДЖАЗА»

БЕЛКАЛЕСПРАМСАЮЗ
аб'яўляе прыём
НА ТРОХМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛТАРАЎ І ПЛАНАВІКОЎ.

На курсы прымаюцца асобы, якія маюць адукацыю не ніжэй 7 класаў.

Курсанты забяспечваюцца інтэрнатам, двухразовым харчаваннем і стыпендыяй у размеры 250 рублёў у месяц.

ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: Няміга, 31, Белкалеспрамсаюз.

МІНСКАМУ
Педагагічнаму інстытуту
патрабуюцца
НА СТАЛУЮ РАБОТУ:

галоўны бухгалтар з прадстаўленнем жылой плошчы, начальнік Орс'а, бухгалтар сталовай, качагары, сталяры, цесляры, штукатуры, шаўцы, краўцы, прачкі, цырульнік, конюхі-возчыкі.

АДРАС: гор. Мінск, Пушкіна, 35, тэлефон 1-87.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА

Беларускаму Дзяржаўнаму юрыдычнаму інстытуту
ПАТРАБУЮЦЦА
на сталую работу:

заг. канцылярыі, сакратар, машыністка, галоўны бухгалтар, старшы бухгалтар, бухгалтар-касір, заг. гаспадаркі, агент, электраманцёр, столяр, слесар-вадаправодчык, прыбіральшчыцы, качагары, швейцары, грузчыкі і істапнікі.

Звяртацца на адрасу: Мінск, Кірава, 49.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Беларускай Рэспубліканскай канторы Галоўхімзбыта НКХП СССР
ПАТРАБУЮЦЦА
НА СТАЛУЮ РАБОТУ НАСТУПНЫЯ РАБОТНІКІ:

Начальнік і намеснік начальніка апаратыўнага аддзела, таваразнаўцы, хімікі, начальнік планавага аддзела, эканаміст-планавік, галоўны бухгалтар, старшыя бухгалтары, касір-інкасатар, сакратар-сценаграфістка, начальнік гаспадарчага аддзела, машыністка, кур'ер, уборшчыцы, заг. складамі хімікатаў, лакаў і фарбаў, экспедытар, кладаўшчыкі і рабочыя складаў.

ЗА ЎСІМІ ДАВЕДКАМІ ЗВЯРТАЦЦА — гор. Мінск, Інтэрнацыянальная, 25, кв. 8.

ГАЛОЎХІМЗБЫТ.

УПРАЎЛЕННЕ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета

У памяшканні Акруговага Дома Чырвонай Арміі імені Маршала Совецкага Саюза К. Е. Барашылава

26 лістапада **КАНЦЭРТ**

НАРОДНАГА АРТЫСТА БССР І. М. БАЛОЦІНА

Партыю раяля выконвае С. Л. ТАЛКАЧОЎ.

Каса з 14 гадзін. ПАЧАТАК у 19 гадз. 30 мінут.

КАНТОРЫ І АДДЗЯЛЕННІ
Дзяржаўнага банка на тэрыторыі Беларускай ССР
прымаюць грашовыя ўклады ад прыватных асоб.

Першапачатковая сума ўкладу — 3.000 рублёў, наступныя ўклады сумай не абмежаваны.

Па тэрміновых укладах Дзяржбанк налічае 5 проц. гадавых, па бестэрміновых — 3 проц.

Укклады выплачваюцца бесперашкодна ў любой суме па першаму патрабаванню ўкладчыка.

Дзяржбанк гарантуе поўную тайну ўкладаў.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Уносячы ў Дзяржбанк ва ўклад свае грашовыя зберажэнні, вы, апрача асабістай выгады, аказваеце дапамогу ў хутчэйшай перамозе над ворагам.

Беларуская рэспубліканская кантора Дзяржаўнага банка Саюза ССР.

МІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
педагагічны настаўніцкі інстытут імені Горкага
АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР
НА ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ІНСТЫТУТА.

Прымаюцца асобы, якія скончылі 9 класаў сярэдняй школы і прыроўненыя да іх навучальныя ўстановы, без іспытаў.

Тэрмін навучання 10 месяцаў.

Прыём заяў да 15 снежня.

Заявы падаваць на імя дырэктара інстытута з прыкладаннем аўтабіяграфіі і дакумента аб асвеце. Пашпарт прад'яўляецца асабіста.

Залічаныя забяспечваюцца стыпендыяй, харчаваннем і інтэрнатам—нароўні са студэнтамі інстытута.

АДРАС: гор. Мінск, вул. Пушкіна, 35, тэлефон 1-87.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

Аддзелу рабочага забеспячэння БЕЛТРАНСЛЕСУ
патрабуюцца на работу
У ГОРАДЗЕ МІНСКУ І АДДЗЕЛАХ РАБОЧАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЛЕСАПРАДПРЫЕМСТВАЎ У РОЗНЫХ АБЛАСЦЯХ РЭСПУБЛІКІ:

бухгалтары, бухгалтары-рэвізоры, інвентарызатары, эканамісты, інспектары, тавараведы, аграномы, касіры.

ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: пасёлак Комінтэрн, Рабочы завулак, дом № 5

Беларускаму Дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны
патрабуюцца
на сталую работу:

экскурсаводы, кансультант па ўзбраенню, наглядальнікі выставачных залаў, сценаграфістка, макетчыкі, качагар, істапнікі, прыбіральшчыцы, рабочыя склада, пячнік, шклоўшчык, цясляр і сталяры.

З прапановамі звяртацца па адрасу: гор. Мінск, плошча Свабоды, музей—з 12 да 16 гадзін штодзённа, апрача нядзелі.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Адказны рэдактар В. САМУЦІН.

АТ00313 Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149. Адказнага сакратара—150.